

КІТАЙСКІ ВЕКТАР ДЛЯ БЕЛАРУСКАЙ ІТ-БУДУЧЫНІ 4

АНДРЭЙ ХУДЫК — ПРА ЭКАЛОГІЮ КРАІНЫ 7





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 ЧЭРВЕНЯ 2018 г. АЎТОРАК № 105 (28721)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл РУСЫ, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Сёлета ў сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я веснавыя палявыя работы пачаліся на два тыдні пазней за леташнія. Разам з тым, дзякуючы добра арганізаванай працы на месцах, адставанне па тэмпах і аб'ёмах ліквідавана. Яравая сяўба завершана. Такія тэмпы работ, а таксама той факт, што на 11 % больш было ўнесена мінеральных угнаенняў, дазваляюць спадзявацца на вынік не горшы, чым у 2017-м. Высокія тэмпературы мая прывялі да выспявання кармавых і развіцця асноўных сельгаскультур. Гэта дазваляе прагназаваць больш паўнавартасны другі ўкос траваў, больш раннія тэрміны ўборкі збожжа».*

■ Фестывалім!

# СВЯТА СЯБРОЎСТВА І НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДЗІНСТВА

### У Гродне чарговы раз «прызямліўся» фестываль нацыянальных культур






Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**У канцы мінулага тыдня горад над Нёманам быў напоўнены пярэстымі фарбамі і разнастайнымі гукамі. У Гродне ўжо 12-ы раз сабраліся прадстаўнікі 35 нацыянальнасцяў, менавіта тут можна было пазнаёміцца з іх традыцыйнымі ўборамі, песнямі, танцамі, стравамі і напоямі, якія размясціліся на 19 падворках. Кожная такая пляцоўка на час фестывалю стала гастранамічным раем і культурным міні-цэнтрам.**

СТАР. 12

## КОРАТКА

• **Падчас маніторынгу правядзення вясновых палявых работ у арганізацыях АПК Віцебскай вобласці распачата 10 крымінальных спраў.**

• Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін падпісаў закон «Аб мерах уздзеяння (процідзеяння) на недружалюбныя дзеянні Злучаных Штатаў Амерыкі і іншых замежных дзяржаў».

• **Акцёр Вялікага драматычнага тэатра імя Г. А. Таўстаногава — народны артыст Расіі, ураджэнец Віцебска Леанід Невядомскі памёр 3 чэрвеня на 79-м годзе жыцця. За 51 год службы ў ВДТ Леанід Невядомскі выканаў больш за 40 роляў. Акцёр таксама зняўся больш чым у 100 кіна- і тэлефільмах.**



• Каманда Беларусі заняла першае месца ў II Чэмпіянаце свету па лоўлі рыбы фідарам сярод клубаў, які прайшоў на вяслярным канале, што размешчаны на ўскраіне Заслаўя.



# КАЛІ РЫНАК ПРАЦЫ — АГУЛЬНЫ

### Што будзе з пенсіямі працоўных мігрантаў?

### Мінпрацы і сацабароны расказала аб пенсійным забеспячэнні работнікаў дзяржаў — членаў ЕАЭС

**Пасля стварэння ЕАЭС беларусам стала прасцей уладкавацца на працу ў дзяржавах, якія з'яўляюцца членамі Еўразійскага эканамічнага саюза. А паколькі чалавек заўсёды шукае, дзе лепш, тут жа актывізавалася працоўная міграцыя. Колькасць беларусаў, якія выехалі на работу ў Расію па афіцыйных заключаных дагаворах і кантрактах, у 2014—2017 гадах склала крыху больш за 21 тысячу чалавек. Гэта звесткі МУС. Але спецыялісты кажуць, што насамрэч працоўных мігрантаў нашмат больш. Пры гэтым расіяне таксама прыязджаюць да нас і ўладкоўваюцца тут на работу. А што ў такім выпадку будзе з пенсіямі працоўных мігрантаў — якая дзяржава павінна іх плаціць?**

Каб зняць гэтыя пытанні, зараз ідзе работа над падрыхтоўкай Дагавора аб пенсійным забеспячэнні работнікаў дзяржаў — членаў ЕАЭС. Між тым спецыялісты ўжо пачынаюць спрэчкі вакол яго. У прыватнасці, ёсць меркаванне, што беларусы, якія працуюць у Расіі, адлічваюць узносы і робяць уклад у фарміраванне расійскага пенсійнага фонду. Пры гэтым у большасці выпадкаў дажываць свой век нашы суайчыннікі вяртаюцца на радзіму. Некаторыя эксперты робяць выснову, што ў выніку гэта прывядзе да ўзрастання нагрузкі на наш Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.

У сувязі з гэтым Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі выступіла з тлумачэннем будучых падыходаў да пенсійнага забеспячэння работнікаў дзяржаў — членаў ЕАЭС.

Базавы прынцып, пакладзены ў аснову праекта Дагавора, — прынцып прапарцыянальнасці, тлумачаць у Міністэрстве працы і сацабароны. Гэта азначае, што ў перыяд работы ўзносы выплачваюцца ў пенсійны фонд дзяржавы, на тэрыторыі якой яна выконваецца. А дзяржавы — члены ЕАЭС прымаюць на сябе адказнасць па фінансаванні будучых пенсій работнікам-мігрантам за перыяды працы на сваёй тэрыторыі (як было б, калі б гэтыя грамадзяне пражывалі ў краіне працаўладкавання). Гэта значыць, Беларусь будзе выплачваць пенсію за перыяды работы на сваёй тэрыторыі, а пенсіі за перыяд працы ў іншых дзяржавах — членах ЕАЭС будуць выплачвацца з пенсійных фондаў гэтых дзяржаў.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, афарміўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# НА ВАРЦЕ НАШАЙ БЯСПЕКІ

## Вынікі другога дня наведвання Прэзідэнтам Брэсцкай вобласці

**Аляксандр Лукашэнка наведаў Брэсцкую пагранічную групу, якая ахоўвае мяжу з Польшчай і Украінай працягласцю ў 349 кіламетраў. Спачатку кіраўніку дзяржавы далажылі аб стане спраў на ўчастку, паказалі тэхніку, а таксама спартыўную залу, у якой займаюцца вайскоўцы.**



Фота БелТА.

### ІНТАРЭС НАЦЫЯНАЛЬНЫ І МІЖНАРОДНЫ

Пазней на ўрачыстым пастраенні асабовага складу Брэсцкай пагранічнай групы і курсантаў Інстытута пагранічнай службы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў прысутных са стагоддзем утварэння органаў пагранічнай службы Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы са шкадаваннем адзначыў, што сёння ў свеце па-ранейшаму трывожна і непрадказальна. Ваеннае процiборства адбываецца практычна на ўсіх кантынентах планеты, таксама нагнятаецца сілавое супрацьстаянне, у тым ліку непасрэдна на мяжы з Беларуссю.

«Прычым вы, як ніхто іншы, ведаеце, што ўзброеныя сутыкненні пачынаюцца менавіта на граніцы, — адзначыў беларускі лідар. — Няпростыя міжнародныя абставіны і небяспека тэрарыстычных актаў прымушаюць бесперапынна падтрымліваць высокі ўзровень баявой гатоўнасці пагранічных органаў».

Аляксандр Лукашэнка таксама дадаў, што для павышэння баяздольнасці і мабільнасці пагранічныя войскі аснашчаюцца найноўшымі ўзорамі тэхнікі і ўзбраення. Акрамя таго, абсталёўваюцца рубяжы, будуюцца сучасныя комплексы застаў, паляпшаюцца бытавыя ўмовы асабовага складу.

Прэзідэнт падкрэсліў: сёння беларуская памежнікі фактычна стаяць на варце не толькі нацыянальных інтарэсаў сваёй краіны, але і рэгіянальнай, а таксама міжнароднай бяспекі.

«Знаходзячыся на ключавых транзітных шляхах, якія вядуць на Поўнач і Поўдзень, у Еўропу і Азію, Беларусь з'яўляецца надзейным партнёрам многіх дзяржаў у папярэджанні і спыненні трансгранічнай злачыннасці, нелегальнага бізнесу і іншых негатыўных працэсаў, — адзначыў беларускі лідар. — Нашым вайскоўцам удалося значна знізіць наплыў нелегальных мігрантаў у дзяржавы Еўрасаюза».

Ён дадаў, што гарантаваць надзейную бяспеку на граніцы без падтрымкі мясцовага насельніцтва немагчыма, таму неабходна ўвесь час узаемадзейнічаць з жыхарамі памежжа.

### ПЕРАМОГА — САВЕЦКАГА НАРОДА

Пасля гэтага Прэзідэнт адправіўся ў Брэсцкую крэпасць, дзе ўсклаў кветкі да манумента, а потым адказаў на пытанні журналістаў.

Першае датычылася таго, што Беларусь нібыта займаецца гістарычным сепаратызмам — такія паведамленні з'яўляюцца ў прэсе саюзнікаў. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сочыць за гэтай тэмай, пасля чаго выказаўся даволі рэзка і крытычна:

«Камусьці карціць, што дзіўна — у Расіі, прыватызаваць гэтую Перамогу. Як быццам яе не было на вайне іншых — беларусаў, украінцаў, грузін, армянаў, таджыкаў, туркменаў... Увесь Савецкі Саюз ваяваў, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Загінулі нават не сотні і не тысячы, а сотні тысяч. Мы кожнага трэцяга скалечылі і страцілі. Уся Беларусь — гэта помнік. Тысячы спаленых вёсак, ні ў чым не вінаватых людзей, старых, дзяцей».

І агульнай святыняй для многіх народаў з'яўляецца Брэсцкая крэпасць, дадаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, дзяліць Перамогу — гэта ліць ваду на млын сапернікаў і праціўнікаў. Прэзідэнт падкрэсліў, што вельмі негатыўна ўспрымае падобныя заявы, што хтосьці гэтую Перамогу заваяваў у адзіночку.

Пачалі ўжо чапляцца і да свят, што праводзяцца ў Беларусі, традыцый, дадаў кіраўнік дзяржавы. Напрыклад, акцыя «Беларусь помніць» — Прэзідэнт нагадаў, што і ў савецкі час існавалі шэсці ветэранаў да помнікаў з партрэтамі загінулых і дзяржаўнымі сімваламі, каб ушанаваць памяць.

Дарэчы, у іх Аляксандр Лукашэнка прымаў удзел асабіста, людзі ішлі з партрэтамі, нацыянальнымі чырвона-зялёнымі сцягамі — і тады яшчэ «Бессмяротнага палка» не было. «Дык нам што зараз, перакрэсліць нашу традыцыю, выкінуць нашы чырвона-зялёныя сцяжачкі і бегчы за кімсьці?» — спытаў ён у адказ.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сэнс і мэта абедзвюх акцый аднолькавыя — ушанаваць памяць загінулых, таму прыватызацыі быць не павінна, паколькі перамог савецкі народ. Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў і іншы папрок у СМІ: нібыта ў нашай краіне ёсць свая перамога — 3 ліпеня замест 9 мая.

Прэзідэнт нагадаў, што ў нашай краіне на Дзень Перамогі ў юбілейныя даты праводзяцца ваенныя парады, тады як у астатнія гады парад праводзіцца 3 ліпеня — у дзень вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, што сімвалізуе і вызваленне Беларусі ў цэлым. Ён таксама дадаў, што гэтая дата была зацверджана ў якасці Дня Незалежнасці на рэферэндуме.

### ДНЯМІ — НОВЫЯ ВЫКРЫЦЦІ

Другое пытанне датычылася апошніх паведамленняў аб гучных карупцыйных справах — у прыватнасці затрымання памочніка Прэзідэнта — інспектара па Гродзенскай вобласці Сяргея Раўнейкі.

Паводле слоў Прэзідэнта, Раўнейка трапіў у поле зроку больш за паўтара года таму. Перш за ўсё тут спрацавалі дэкларацыі аб даходах: калі ішло кадравае вывучэнне, Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, адкуль у гэтага чалавека такая раскоша: аўтамабілі і кватэры — да дзясятка.

«Але падазрэнне падазрэннем, нейкія былі факты, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Некаторыя бізнесмены звязаны з чыноўнікамі, дык чыноўнік нешта ім робіць. А гэты, дапусцім, каб у Гродзенскай вобласці тытунём гандлявалі, кажа: вы мне плаціце за гэта. Паводзіў сябе як злачынец, самы сапраўдны бандыт».

Беларускі лідар расказаў, што для доказу злачынстваў быў патрэбны выключны факт — так і адбылося: гаворка пра тыя самыя 200 тысяч долараў. Дарэчы, падчас аперацыі, санкцыянаванай самім кіраўніком дзяржавы, Раўнейка быў затрыманы з гэтымі грашыма на руках.

Яшчэ Прэзідэнт расказаў, што днямі мы пачуем новыя факты. Некаторыя людзі ўжо знаходзяцца ў следчым ізалятары, а цяпер рыхтуюцца матэрыялы, якія перададуць сродкам масавай інфармацыі. Кіраўнік дзяржавы таксама дадаў, што яму непрыемна даведвацца аб падобных фактах.

### ПРА РАБОТУ З МОЛАДДЗЮ

Апошняе пытанне датычылася БРСМ: што неабходна для больш эфектыўнай работы гэтай маладзёжнай арганізацыі ў сучасных умовах.

Прэзідэнт адзначыў, што патрэбна жывая работа з моладдзю, каб не было ашуканства, фармалізму, бюракратыі, якія былі ўласцівыя таму камсамолу, у якім быў ён сам, трэба больш жывой справы. Бо, напрыклад, падобныя грамадскія арганізацыі дапамагаюць сфарміраваць той жа кадравы рэзерв. І ў цэлым такую структуру, як БРСМ, можна задзейнічаць у любы час, асабліва — у цяжкі, дадаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, Адміністрацыі Прэзідэнта даручана пачаць цесную работу з БРСМ, каб рэструктурызаваць дзейнасць аб'яднання, вызначыць тыя самыя кірункі працы. Дарэчы, сам Прэзідэнт у найбліжэйшы час асабіста сустрэнецца з кіраўніком гэтага і іншых грамадскіх аб'яднанняў, таксама на сустрэчы будуць прысутнічаць і найбольш актыўныя ўдзельнікі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

---

■ Для бізнесу

## Улічым вашы пажаданні

**Калі для адных выбар прадуктаў абмяжоўваецца толькі ўласным густам і рэлевантнай цаной, іншыя ў дадатак кіруюцца рэлігійнымі ці традыцыйнымі ўстаноўкамі. Бізнес ідзе за пакупніком, таму 6 чэрвеня Цэнтр дзелавой адукацыі БелГПП запрашае на семінар «Асаблівасці атрымання сертыфіката кашэрнасці».**

У ім прымуць удзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ізраіля ў Беларусі Алан Шогам і галоўны рабін Іўдзейскага рэлігійнага аб'яднання ў нашай краіне Мардэхай Райхінштэйн. На мерапрыемстве збяруцца спецыялісты ў галіне забеспячэння і ацэнкі якасці прадукцыі, тэхналагічных аддзелаў, маркетынгу, а таксама кіраўнікі прадпрыемстваў і ІП. Дарэчы, такі сертыфікат з'яўляецца абавязковым для пастаўкі прадукцыі ў Ізраіль і іншыя краіны, дзе спажыўцы яго патрабуюць у дачыненні для пэўных груп тавараў. Мерапрыемства бясплатнае, але зацікаўленыя бізнесмены і спецыялісты павінны папярэдне звярнуцца ў Цэнтр дзелавой адукацыі БелГПП.

**Надзея АНІСОВІЧ**

---

■ Знешняя палітыка

## ГІСТАРЫЧНЫ ВІЗІТ

### Беларусь прапануе запоўніць прабелы ў эканамічным супрацоўніцтве з Манголіяй

**Аб гэтым заявіў міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ на сустрэчы з кіраўніком знешнепалітычнага ведамства Манголіі Дамдзіны Цогтбаатарам.**

Як адзначыў Уладзімір Макей, у апошні час адносіны паміж дзвюма краінамі пачалі развівацца больш актыўна. На яго думку, неабходна пільна паглядзець на ўвесь спектр двухбаковага супрацоўніцтва, паколькі ёсць новыя сферы, дзе можна дасягнуць максімальнага выніку.

Дарэчы, сёння сапраўды аднаўляецца палітычны дыялог з Манголіяй: візіт Дамдзіны Цогтбаатара стаў першым за 17 гадоў на ўзроўні міністра замежных спраў, кіраўнік беларускага МЗС назваў яго гістарычным.

Па выніках сустрэчы Уладзімір Макей расказаў, што Беларусь і Манголія дамовіліся першачарговую ўвагу ўдзяляць пытанням эканамічнага супрацоўніцтва і ўкараненню прагрэсіўных узаемапрымальных схем фінансавання экспарту для рэалізацыі канкрэтных сумесных праектаў.

Бакі дамовіліся рэгулярна праводзіць кансультацыі паміж знешнепалітычнымі ведамствамі на ўзроўні намеснікаў міністраў па прыярытэтных пытаннях узаемаадносін (чарговы раўнд такіх перагавораў адбудзецца ў гэтым годзе ў Мінску), а яшчэ падпісалі пакет міждзяржаўных дагавораў аб супрацоўніцтве ў прававой сферы, які забяспечвае прамое ўзаемадзеянне праваахоўных органаў дзвюх краін.

Акрамя таго, Беларусь актывізуе пастаўкі БелАЗаў і камбайнаў у Манголію. «Мы дамовіліся больш дэталёва паглядзець на перспектывы ўзаемадзеяння ў сферы сельскай гаспадаркі, асабліва з улікам таго, што ў Манголіі актыўна развіваецца жывёлагадоўля. Мы дамовіліся таксама падумаць аб стварэнні сумеснага прадпрыемства, звязанага з перапрацоўкай сельгаспрадукцыі, тым больш што рынак там велізарны», — сказаў Уладзімір Макей.

Дамдзіны Цогтбаатар таксама расказаў, што наступная сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Манголіі можа адбыцца ў найбліжэйшыя дні ў кітайскім Цындаа. Спектр пытанняў для абмеркавання такі: развіццё палітычнага дыялогу, гандлёва-эканамічнага і, магчыма, гуманітарнага супрацоўніцтва, а таксама іншыя.

Ён таксама дадаў, што Манголія зацікаўлена адкрыць пасольства ў Беларусі ў наступным годзе, так што гэта не аддаленая перспектыва.

**Паводле БелТА**

■ Будзь у курсе!

# ВА ЎГОДДЗІ — НІ НАГОЙ

**Наведванне лясоў забаранілі больш чым у 50 раёнах краіны**



Прычына — высокі клас пажарнай небяспекі па ўмовах надвор'я. Абмежавальныя меры дзейнічаюць больш чым у 50 раёнах Гомельскай, Брэсцкай, Гродзенскай і Віцебскай абласцей. У прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі падкрэсліле, што меры абмежавальнага характару ўводзяцца пры наступленні 4-га класа пажарнай небяспекі па ўмовах надвор'я: калі стаіць гарачае, сухое надвор'е, адсутнічаюць ападкі і пажар можа пачацца ад найменшай іскры.

Увядзенне забароны мае на ўвазе поўную адмову ад наведвання лясоў грамадзянамі (у тым ліку для прагулак, адпачынку на прыродзе), а таксама ад уезду транспарту, за выключэннем службовага. Забарона распаўсюджваецца на ўсе дарогі, акрамя дарог агульнага карыстання. Аднак многія раённыя выканаўчыя камітэты ідуць насустрач грамадзянам і выключаюць асобныя тэрыторыі з дзеяння забароны, каб яны змаглі дабрацца да сваіх населеных пунктаў. У такім выпадку, у мэтах бяспекі грамадзян, гэтыя ўчасткі бяруцца пад асаблівы кантроль і патрулююцца спецыялістамі дзяржаўнай лясной аховы. Аналагічная практыка распаўсюджваецца і на збор прадукцыі пабочнага лесакарыстання: грыбоў і ягад. Але нават калі ў раёне не ўведзена забарона на наведванне лясоў, важна памятаць аб выкананні правілаў пажарнай бяспекі. У пажаранебяспечны сезон забараняецца разводзіць вогнішчы ў хвойных несамкнёных дрэвастоях і маладняках 1-га класа ўзросту, на участках пашкоджанага лесу (ветравалу і буралому), тарфяніках, у месцах з падсохлай травой. Пры гэтым развядзенне вогнішчаў (у тым ліку з выкарыстаннем прыстасаванняў: мангалаў, барбекю, грыля, газавых пліт) дапускаецца на спецыяльных уладкаваных пляцоўках, абрамленых мінералізаванай (ачышчанай да мінеральнага пласта глебы) паласой шырынёй не менш за 0,25 метра, а таксама ў месцах, якія выключаюць пашкоджанне агнём крон, ствалоў і каранёвых лап дрэў, акрамя забароненых участкаў. Пасля выкарыстання вогнішча павінна быць патушана да поўнага спынення тлення.

Грамадзяніна, які парушыў забарону на наведванне лясоў, чакае адміністрацыйная адказнасць (артыкул 15.29 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях). І калі ў адным выпадку ўсё можа абмежавацца вусным папярэджаннем, то ў іншым — штрафам у памеры да 25 базавых велічынь (612,5 рубля). Калі ж лясному фонду будзе нанесена яшчэ і шкода, то памер штрафных санкцый можа вырасці да 50 базавых велічынь (1225 рублёў).

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Добрая навіна

# ДА МАСКВЫ — КРЫХУ БОЛЬШ ЗА ГАДЗІНУ

**Першым пасля 10-гадовага перапынку авіярэйсам з Масквы ў Гомель прыляцелі 40 пасажыраў.**

Цяпер на паветраным лайнеры Embraer 170 можна паляцець у сталіцу Расіі тры разы на тыдзень: у сераду, пятніцу і нядзелю. Менш чым паўтары гадзіны зойме шлях у адзін бок. Вылет з аэрапорта Дамадзедава ажыццяўляецца ў 9.55, прылёт у Гомель — у 11.20. З Гомеля самалёт вылятае ў 12.05 і прыбывае ў Маскву ў 13.35. Час у палёце — 1 гадзіна 20 хвілін. Кошт білета ў залежнасці ад тэрмінаў браніравання і наяўнасці багажу — ад 45 да 50 еўра. Камерцыйны дырэктар S7 Group Ігар Вераценнікаў адзначыў, што пасажыры з Беларусі, якія часта наведваюць сяброў і сваякоў ці працуюць у Расіі, ацэняць камфорт авіяпадарожжа.

Між тым цяпер лятаць самалётам з Гомеля ў Маскву аказваецца крыху даражэй, чым ехаць туды на маршрутным таксі. У купэйным вагоне дабрацца да сталіцы Расіі з Гомеля будзе каштаваць прыкладна столькі ж, але ж многія аддадуць перавагу захаванаму часу. Дарэчы, да сярэдзіны чэрвеня ўсе білеты ўжо раскуплены.

У Гомельскім аэрапорце не выключаюць, што расійскі лайнер у хуткім часе будзе лятаць і штодзень.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Шэсць краін з «вялікай сямёркі» абрынуліся з крытыкай на ЗША

Міністр фінансаў ЗША Стыў Мнучын сутыкнуўся з рэзкай крытыкай з боку раз'юшаных калег з краін G7, незадаволеных павышэннем пошлін на імпарт сталі і алюмінію. Напрыклад, кіраўнік французскага Мінфіна Бруно Ле Мэр заявіў, што ў Вашынгтона ёсць усяго некалькі дзён, каб пазбегнуць гандлёвай вайны з саюзнікамі. Такія рэзкія размовы адбыліся падчас трохдзённай сустрэчы кіраўнікоў фінансавых ведамстваў «вялікай сямёркі», якая праходзіла ў Канадзе. Па выніках сустрэчы не было нават прынята сумеснай заявы, што, на думку BBC, можна лічыць відавочнай прыкметай разладу. Гарачыя дэбаты, хутчэй за ўсё, будуць працягвацца і на саміце. Як вядома, у наступныя выхадныя ў Квебеку адбудзецца саміт лідараў краін G7 уключна з прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам.

### Пэдра Санчэс прынёс прысягу ў якасці кіраўніка ўрада Іспаніі



У мінулую пятніцу Кангрэс дэпутатаў (ніжняя палата парламента) краіны адмовіў у даверы ўраду Марыяна Рахоя. Падставай для гэтага стаў вердыкт суда па гучнай карупцыйнай справе, у якую былі ўцягнутыя прыхільнікі Народнай партыі Рахоя. Іх абвінавачвалі ў хабарніцтве, адмыванні грошай і ўхіленні ад выплаты падаткаў. У выніку новым прэм'ерам стаў 46-гадовы генеральны сакратар Іспанскай сацыялістычнай рабочай партыі Пэдра Санчэс. Цырымонія адбылася ў каралеўскай рэзідэнцыі Сарсуэла ў прысутнасці манарха Філіпа VI. Санчэс, паклаўшы руку на канстытуцыю Іспаніі, паабяцаў «добрасумленна выконваць свае абавязкі» і захоўваць вернасць каралю і асноўнаму закону краіны. Упершыню ў дэмакратычнай гісторыі Іспаніі цырымонія прайшла без каталіцкіх сімвалаў: Біблії і распяцця.

### Цэнтр Парыжа зачысцілі ад бежанцаў

Парыжскія паліцэйскія ліквідавалі два лагеры бежанцаў на тэрыторыі французскай сталіцы. Пра гэта паведаміла The Local. 800 мігрантаў эвакуявалі з берага канала Сен-Мартэн і яшчэ каля 400 прымусілі пакінуць лагер у раёне Порт-дэ-ля-Шапель. Як паведамілі ў паліцыі, мігрантаў перавядуць у іншае месца і прымусяць прайсці пільную праверку на легальнасць знаходжання ў Францыі. Тыднем раней улады ўжо ачысцілі ад больш як 1,7 тысячы бежанцаў з Судана, Самалі і Эрытрэі раёны каля станцыі метро Порт-дэ-ля-Вілет. На думку ўлад, лагеры бежанцаў «ствараюць гуманітарную пагрозу і становяцца невыноснымі для Парыжа».

### Дзясяткі людзей загінулі пры вывяржэнні вулкана ў Гватэмале

По меншай меры 25 чалавек загінулі і сотні атрымалі раненні пры вывяржэнні вулкана Фуэга, размешчанага за 40 км на паўднёвы захад ад сталіцы Гватэмалы. Вулкан вывяргаецца распаленай лавай, попел асядае ў наваколлі. Дакладная колькасць загінулых пакуль невядомая, але, хутчэй за ўсё, іх будзе больш. Прадстаўнікі выратавальных службаў кажуць, што не могуць дабрацца ў некаторыя раёны. Сталічны аэрапорт зачынены. Па даных улад Гватэмалы, каля трох тысяч чалавек былі эвакуяваныя. Усяго на тэрыторыі, пацярпелай ад вывяржэння, пражывае больш за 1,7 млн чалавек. Улады просяць людзей трымацца далей ад рэк, паколькі па іх ідуць камяні і лава. Паводле апошніх даных, паток лавы змяніў кірунак і накрыў горад Эль-Радэа з насельніцтвам каля 14 тысяч чалавек і вёску Ла-Ліберэтад у дэпартаменце Сан-Маркас. Паведамляецца, што многія людзі загінулі проста ў сваіх дамах.



■ Надвор'е

# СПЯКОТА АДПУСЦІЦЬ

**А на тарфяніках Палесся ўначы нават слабыя замаразкі**

**У бягучыя суткі тэрыторыя нашай краіны апынецца пад уплывам атмасфернага фронту, дажджоў будзе няшмат, але за фронтам пачне паступаць больш халоднае паветра з поўначы Еўропы. І пахаладае, перадае Белгідрамет.**

Чакаецца рэзкае пахаладанне, уначы аж да адмоўных тэмператур. Так, заўтра днём месцамі па паўночна-ўсходняй частцы краіны, а ўначы па поўначы нашай тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—8 цяпла, у асобных раёнах на тарфяніках Брэсцкай вобласці магчымы слабыя замаразкі да нуля — мінус 2 градусаў. Тэмпература паветра ўдзень складзе ад плюс 14 да плюс 19 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны паветра прагрэецца да 20—22 цяпла.

У чацвер будзе пераважна без ападкаў. Уначы — ад 2 да 8 градусаў цяпла, у асобных раёнах на тарфяніках Палесся магчымы слабыя замаразкі да нуля — мінус 2 градусаў. А ўдзень будзе да 17—24 цяпла. Пераважна без ападкаў і ў пятніцу, толькі па паўночным усходзе краіны месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—12 цяпла, удзень — ад плюс 19 па паўночным усходзе да плюс 26 градусаў па паўднёвым захадзе краіны. І далей зноў гарачыня. Чэрвень.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Знак якасці

# Надзейны аператар

**Белпошта аказалася на 32-м месцы сярод 173 паштовых аператараў у параўнальным інтэграваным індэксе паштовага развіцця (Integrated Index for Postal Development).**

З постсавецкіх краін абысці нас змаглі толькі Эстонія (13-ы радок рэйтынга), Літва (22-і) і Малдова (27-ы). Украіна аказалася на 33-й пазіцыі, Расія — на 37-й. Найлепшай стала служба Швейцарыі. На другім месцы Нідэрланды, на трэцім — Японія. На думку экспертаў, гэтыя краіны змаглі наладзіць сетку, якая выклікае давер, стабільна выконвае свае абавязкі і пастаянна ўкараняе найноўшыя тэхналогіі.

Рэйтынг выпушчаны Сусветным паштовым саюзам у рамках Справаздачы аб паштовым развіцці — 2018. Спіс складзены на падставе наступных параметраў развіцця: надзейнасць, ахоп, рэлевантнасць і ўстойлівасць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■ Здарэнні

## Дзеці падаюць з вокнаў

**Спякота правакуе няшчасныя выпадкі з дзецьмі. Адчыненыя вокны нават на першым паверсе тояць небяспеку, калі ў доме малое.**

У Пружанах у нядзелю двухгадовы хлопчык узлез на падаконнік, націснуў на маскітную сетку і выпаў разам з ёй. Дзіця ўпала з вышыні двух з паловай метраў, вынікам падзення сталі цялесныя пашкоджанні.

А літаральна некалькі дзён таму ў Кобрыне трохгадовае дзіця выпала з пятага паверха. У кватэры знаходзілася маці малога, яе сястра і трое дзяцей. З цяжкімі траўмамі дзіця дастаўлена ў бальніцу.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## У лесе ўпаў паратрайк

**Відавочца паведаміў у МНС пра падзенне ў лясным масіве паблізу вёскі Лашаны Мінскага раёна паратрайка — лёгкага лятальнага апарата.**

— Згодна з папярэдняй інфармацыяй, падчас палёту мог абарвацца строп, — паведаміла **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Пры падзенні мужчына, які кіраваў лятальным апаратам, атрымаў траўму пляча. Нашы работнікі аказалі яму дапамогу і перадалі брыгадзе медыкаў. Стан пацярпелага здавальняючы. Прычыны здарэння высвятляюцца.

## Пенсіянерку адшукаў квадракоптар

**82-гадовую жанчыну, якая заблудзіла пад Уздой, знайшлі пры дапамозе квадракоптара.**

Паводле інфармацыі УУС Мінаблвыканкама, пенсіянерка выйшла з дому 30 мая і знікла. Знайшлі жыхарку горада толькі 2 чэрвеня. У міліцыі вызначылі магчымыя кірункі пошукаў, а дапамаглі іх адпрацаваць валанцёры. На відэа, якое зняў квадракоптар, на адным з участкаў мясцовасці была заўважана цёмная пляма. Гэта магла быць куртка зніклай жанчыны. Пры праверцы гэтай версіі пенсіянерка і была знойдзена. Для аказання медыцынскай дапамогі яе тэрмінова даставілі ў бальніцу.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ У лічбавым фармаце

# Кітайскі досвед для беларускай IT-сферы

## Кірыл Руды расказаў пра асаблівасці развіцця інфармацыйных тэхналогій Паднябеснай і пра тое, на што магчыма арыентавацца беларусам



У канцы XX стагоддзя структурныя эканамічныя рэформы далі свету «Кітайскі цуд». Дзякуючы доўгаму перыяду ўстойлівага росту ВУП Кітаю ўдалося стварыць сучасную прамысловасць, удасканаліць інфраструктуру, новыя вытворчасці. Сёння эканоміка Кітая па ўзроўні ВУП з'яўляецца другой пасля ЗША. У КНР таксама зрабілі і вялікі рывок у развіцці IT-сферы. На думку **Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла Беларусі ў Кітаі Кірыла РУДАГА,** беларускім распрацоўшчыкам ёсць на што арыентавацца. Маючы васьмігадовы вопыт жыцця ў Кітаі, ён расказаў на міжнародным форуме «ТІБО-2018», які нядаўна прайшоў у Мінску, у якую будучыню рухаецца інфармацыйная трансфармацыя Паднябеснай і на які яе вопыт варта больш уважліва глядзець у Беларусі пры пераходзе да лічбавай эканомікі.

### BIG DATA ДЛЯ ВЯЛІКАЙ КРАІНЫ

На думку пасла, кітайская мадэль развіцця IT-індустрыі ўнікальная і супярэчлівая адначасова. З аднаго боку, можа скласціся ўражанне, што ў Кітаі сайты і сацыяльныя сеткі жорстка кантралююцца. З другога боку, гучаць захопленыя водгукі, што ў Паднябеснай усё прадумана, хутка, мноства IT-паслуг і прадуктаў.

Нягледзячы на гэта, Кірыл Руды адзначыў, што Кітай — IT-краіна, якая хутка расце. Колькасць інтэрнэт-карыстальнікаў у Паднябеснай складае 773 мільёны чалавек. Кожны месяц яна расце на колькасць усіх інтэрнэт-карыстальнікаў Беларусі. Асноўным напрамкам працы ў IT з'яўляецца апрацоўка big data (вялікіх даных). Ён раскрываецца ў гандлі, вела-шэрынгу, каршэрынгу, у даследаванні штучнага інтэлекту, у грамадскай бяспецы, у сістэме грамадскага кантролю.

Як гэта дапамагае на справе? Напрыклад, у гандлі аналіз даных дазваляе імгненна рэагаваць на змены і скарачаць разрыў паміж дызайнам і вытворчасцю да некалькіх дзён. А гэта сціране такія паняцці, як, напрыклад, вясновая або зімовая калекцыі адзення.

«Усё гэта паскарае тавараабарот і рост эканомікі. Лічыцца, што толькі тэхналогіі big data забяспечваюць прырост ВУП Кітая ў сярэднім на 2 % у год», — адзначыў пасол.

### БЕЗНАЯЎНЫ СВЕТ

Кітай — гэта безнаяўная IT-краіна. Амаль палова кітайцаў выходзіць з дому менш чым з 15 доларамі наяўных у кішэні. Ва ўсіх крамах, кіёсках вулічнага гандлю разлічваюцца сканоючы тэлефонам QR-код.

«Галоўная праблема, з якой я сутыкаўся ў краме, — гэта незадаволенасць людзей, бо я, як правіла, з'яўляюся адным з нямногіх пакупнікоў, у каго ёсць наяўныя грошы ў краме, і прадаўцу прыходзіцца шукаць мне рэшту», — расказаў Кірыл Руды.

Таксама ён адзначыў, што кожны месяц 500 мільёнаў кітайцаў заказваюць тавары праз мабільныя праграмы. Пры гэтым рынак анлайн-гандлю Кітая расце ў два разы хутчэй за рынак ЗША.

«Развіццё IT-галіны змяняе эканоміку Кітая, накіроўваючы збераженні кітайцаў у спажыванне, павялічае інвестыцыі не ў вытворчасць, а ў паслугі, дызайн, брэнд. У выніку паслугі ўжо фарміруюць больш за палову эканомікі Кітая», — падкрэсліў пасол.

### СТАРТАП-ДЗЯРЖАВА

Кітай — гэта стартап-краіна. Больш за 60 % ВУП Кітая стварае малы і прыватны бізнес, які штодня «памірае» і «перараджаецца».

«Калі вы былі ў Кітаі і вам спадабаўся нейкі маленькі магазін, рэстаран, цырульня, то наступны раз, калі вы туды прыедзеце, іх ужо дакладна не будзе. Доля IT-стартапаў у Кітаі складае 10 %. У іх асаблівая экасістэма: з аднаго боку, гэта інфраструктура, бізнес-інкубатары, венчурныя фонды, з другога боку, у Кітаі сфарміравалася норма і звычка пастаянна пачынаць спачатку», — расказвае Кірыл Руды.

І нягледзячы на тое, што 90 % стартапаў у Кітаі знікаюць на працягу першага года, той, хто выжывае, ператвараецца ў буйную міжнародную карпарацыю.

### БАЧАЦЬ СВАЮ БУДУЧЫНЮ

Кітай — гэта краіна з выразным бачаннем сваёй IT-будучыні. Сёння ў КНР ёсць тры найбуйнейшыя стратэгіі. Адна з іх называецца «Зроблена ў Кітаі — 2025», па якой адбываецца падтрымка развіцця ўласных тэхналогій. Другая — па распаўсюджванні інтэрнэту ва ўрадзе, вытворчасці, гандлі, сельскай гаспадарцы і іншых галінах. Трэцяя — дзесяцігадовая стратэгія інфарматызацыі.

«Якая роля дзяржавы ў гэтым працэсе? Галоўнае, чым займаецца дзяржава ў IT-сферы, — вызначае мэты і тэрміны, ствараючы інфраструктуру, падтрымлівае малы бізнес, прыцягвае высокакваліфікаваныя кадры. Астатняя фінансавыя стымулы ажыццяўляюцца на рынкавых умовах», — дадаў пасол.

Так, у Кітаі няма спецыяльных падатковых ільгот і бюджэтных субсідый. Разам з тым у Паднябеснай цалкам разумеюць, што яны пакуль яшчэ з'яўляюцца IT-краінай, якая развіваецца і ў якой менш за 50 % тэрыторыі пакуль пакрыта 4G-інтэрнэтам. Пранікненне інтэрнэту складае 58 % сярод насельніцтва (у Беларусі 71 %, у ЗША 96 %).

### ПАСЛАБЛЕННІ Ў ВЯЛІКІМ КІТАЙСКІМ ФАЕРВОЛЕ

Пасол таксама адзначыў, што Кітай усё яшчэ застаецца цэнтралізаванай IT-краінай, а сфера ІКТ — манапалізаванай. Напрыклад, такія кампаніі, як Alibaba і Tencent, валодаюць 90 % усяго анлайн-гандлю, 85 % анлайн-плацяжоў, 85 % сацыяльных сетак. IT-рынак Кітая практычна закрыты ад знешняй канкурэнцыі. Напрыклад, там ёсць нават свае аналагі сацыяльных сетак і месенджараў, створаныя з мэтай цалкам замяніць найбольш папулярныя з іх у свеце накшталт Facebook і WhatsApp.

«Таксама ў КНР стварылі ўласную псіхалогію спажывання, што тлумачыць забарону крыптавалют і развівае кіраваны блокчэйн», — дадаў Кірыл Руды.

Разам з гэтым з ростам даходаў насельніцтва растуць і патрабаванні да якасці, а бізнес-мадэль нізкай цаны фарміруе прадузятае стаўленне да кітайскіх прадуктаў.

«Аднак у Паднябеснай бачаць гэтыя рызыкі. У IT-сферы зараз адбываецца дэцэнтралізацыя. Таксама ўзнікае ўсё больш стартапаў, якія канкуруюць з манаполіямі», — рэзюмаваў пасол.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Партнёрства

# КІБЕРБЯСПЕКА + ІНФАРМАЦЫЙНАЯ АДУКАВАНАСЦЬ

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і кампанія МТС маюць намер прадоўжыць сумесныя адукацыйныя праекты. Адпаведнае пагадненне аб супрацоўніцтве падпісалі міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА і генеральны дырэктар МТС Уладзімір КАРПОВІЧ.**




Сімвалічна, што заключэнне пагаднення адбылося ў Дзень абароны дзяцей, бо адзін з самых пазнавальных сумесных праектаў МТС і Міністэрства адукацыі — «Дзеці ў інтэрнэце». Навучанне бяспечным паводзінам у сеціве за два гады прайшлі 8,5 тысячы малодшых школьнікаў ва ўсіх рэгіёнах краіны. У гэтым годзе праект трансфармаваўся ў інтэрактыўную выстаўку, якую анансавалі на ТІБО-2018. У поўным фармаце яна адкрыецца восенню ў Мінску. Плануецца, што затым інтэрактыўная выстаўка працягне сваю работу ў кожным з абласных цэнтраў.

Яшчэ адзін сацыяльна важны і цікавы праект — «Адказныя паводзіны настаўнікаў у сеціве», мэта якога — дапамагчы педагогам карэктна і без рызыкі для сваёй рэпутацыі кантактаваць з вучнямі ў інтэрнэце. Надзвычай важна, каб вобраз настаўніка ў класе і ў сацыяльных сетках супадаў. Навучанне этыцы паводзінаў у інтэрнэце ўжо прайшлі больш як 800 педагогаў.

У рэспубліканскім конкурсе «Інфармацыйныя і мабільныя тэхналогіі для адукацыйнага працэсу», які праводзіцца кампаніяй МТС сумесна з Міністэрствам адукацыі сярод старшакласнікаў і студэнтаў ВНУ, удзельнічалі летась больш як 150 інавацыйных праектаў. З іх было выбрана 20 найлепшых, якія могуць укараняцца ў навучальна-выхаваўчы працэс, а іх аўтары атрымалі прызы ад МТС і партнёраў конкурсу.

Пасля падпісання пагаднення аб супрацоўніцтве міністр адукацыі Ігар Карпенка расказаў журналістам аб прыняцці рашэння стварыць сектаральны савет па IT-адукацыі. «Цяпер фарміруецца яго склад, праграмуем план работы. У рамках гэтага савета мы сур'ёзна паглядзім на змест IT-адукацыі — як прафесійнай, так і школьнай», — падкрэсліў Ігар Карпенка. Савет ствараецца на базе Міністэрства адукацыі, Міністэрства сувязі і інфарматызацыі і Парка высокіх тэхналогій. Яго члены прааналізуюць навучальныя планы, праграмы па гэтым кірунку, у цэлым змест работы. «Магчыма, ёсць сэнс адмовіцца ад жорсткага навучальнага плана па курсе інфарматыкі ў сярэдняй школе. Можа быць, варта выпрацаваць нейкі спіс кампетэнцый, якімі павінен валодаць навучэнец, што заканчвае агульную сярэднюю школу», — адзначыў міністр.

Па словах Ігара Карпенкі, сектаральны савет павінен адыграць важную ролю ў набліжэнні зместу адукацыі да IT-сектара. Міністр адзначыў, што ў новую рэдакцыю Кодэкса аб адукацыі закладзена такое паняцце, як прыкладны навучальны план. Гэта дазволіць самой ВНУ карэктаваць змест адукацыі з улікам пажаданняў канкрэтных арганізацый — заказчыкаў кадраў.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

# КАЛІ РЫНАК ПРАЦЫ — АГУЛЬНЫ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Спецыялісты міністэрства адзначаюць, што на сучасным этапе прымяненне прапарцыянальнага прынцыпу апраўдана з пункту гледжання інтарэсаў дзяржавы ў цэлым: пры вяртанні мігрантаў на радзіму выдаткі на пенсіі за «замежны» стаж застаюцца за краінамі, у якіх вялася працоўная дзейнасць (калі пры гэтым выплачваліся пенсійныя ўзносы), і не ўскладняюцца на краіну пражывання пенсіянера. У той жа час работнікам даецца права на атрыманне пенсійных выплат ад кожнай з дзяржаў, на эканоміку якіх яны працавалі. Такі прынцып апрабаваны міжнароднай практыкай і выкарыстоўваецца многімі краінамі пры заключэнні міжнародных пенсійных пагадненняў.

Калі ж пералічваць («пераводзіць») унёскі за перыяды працы на тэрыторыі дзяржаў — членаў ЕАЭС у пенсійны фонд краіны па ранейшым месцы жыхарства работніка, як прапануюць некаторыя эксперты, гэта можа прывесці да нарошчвання пенсійных абавязацельстваў краіны месца пражывання. Да таго ж забяспечыць і пракантраляваць выкананне заканадаўства аб выплаце ўнёскаў работнікамі — нерэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь немагчыма, дадаюць спецыялісты Мінпрацы.

> Таксама немагчыма ў перыяд працы чалавека адназначна вызначыць, якую з дзяржаў ён абярэ для пастаяннага пражывання пасля выхаду на пенсію. І тады можа атрымацца так, што грамадзянін, які пераводзіў унёскі ў Беларусь, а пасля выраашыў туды не вяртацца, наогул акажацца без пенсіі.

* * *

Такім чынам, калі дакумент будзе прыняты і ратыфікаваны краінамі — удзельнікамі ЕАЭС, Беларусь будзе несці адказнасць (выплачваць пенсію) за перыяды працы грамадзян гэтых краін на сваёй тэрыторыі. Пенсіі за стаж працы ў дзяржавах — членах ЕАЭС будуць выплачвацца з пенсійных фондаў гэтых дзяржаў. Як падкрэсліваюць у Мінпрацы, гэта значыць, што ў нашай краіне нагрузка на фонд сацыяльнай абароны насельніцтва па фінансаванні пенсій мігрантам будзе не ўзрастаць, а абмяжоўвацца.

Пры гэтым кожная краіна — удзельніца Дагавора ЕАЭС павінна будзе забяспечыць улік працоўнага стажу на сваёй тэрыторыі і выплату заробленай часткі пенсіі (у памеры, прадугледжаным нацыянальным заканадаўствам дзяржавы, дзе працакала работа).

У Мінпрацы адзначаюць, што ўсе базавыя пазіцыі праекта (у тым ліку аб выплаце ўнёскаў у пенсійны фонд дзяржавы працаўладкавання) у цяперашні час ужо дзейнічаюць у рамках Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння (які быў заключаны 24 студзеня 2006 года і ўступіў у сілу 29 сакавіка 2007 года). Гэта значыць, яны ўжо выверныя больш чым дзесяцігадовай практыкай беларуска-расійскіх узаемаадносін у галіне забеспячэння права на атрыманне пенсій грамадзянамі.

У Еўразійскім эканамічным саюзе пастаўлены мэты актывізаваць інтэграцыйныя працэсы і легальную міграцыю, павысіць адкрытасць нацыянальных рынкаў і стварыць агульны рынак працы. І нормы, што заключаюцца ў Дагаворы аб пенсійным забеспячэнні, павінны спрыяць, а не перашкаджаць вырашэнню гэтых задач. У цэлым, як адзначаюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны Беларусі, галоўнае прызначэнне Дагавора — сфарміраваць механізм, які забяспечваў бы работнікам магчымасць рэалізаваць у поўным аб'ёме пенсійныя правы, зароблены на тэрыторыі дзяржаў — членаў ЕАЭС, незалежна ад таго, у якой з гэтых дзяржаў яны будуць пражываць, калі выйдуць на пенсію.

**Святлана БУСЬКО.**

■ Падпіска

# Як «Звязда» пасябравала з «Залатой пчолкай»



Фестывальная алея.

**Для тых, хто не ў курсе, гэта міжнародны дзіцячы фестываль, які ўжо 17-ы раз праходзіў у Клімавічах. Свята доўжылася аж чатыры дні і кожны з іх праходзіў пад асобны назвай — «Дзень беларускай гасціннасці», «Дзень шчаслівага дзяцінства», «Дзень садружнасці нацыянальных традыцый», «Дзень сугучча талентаў».**

Дзіцячы форум з'яўляецца сур'ёзнай рэпетыцыяй для тых, хто жадае падняцца на музычны Алімп. Тут строгае міжнароднае журы і патрабавальная публіка. На сцэне «Залатой пчолкі» ў свой час выпрабоўвалі талент зоркі дзіцячага Еўрабачання — Ксенія Сітнік і Андрэй Кунец.

Фестываль у Клімавічах вельмі любяць і чакаюць. Акрамя таго, што тут выпрабоўваюць сябе ўсе тыя, хто пяюць і танцуюць, гэта яшчэ і цікавыя пляцоўкі для інтэрактыўных гульняў, выставы, майстар-класы, атракцыёны, падарожжы, вясёлыя конкурсы і імпрэзы. І ўсё гэта пад музыку і энергічнае падбадзёрванне вядучых. Гарадскога парку не хапае, каб умясціць усё, што дэманструе і прапануе гэта свята.

І палатка раённага вузла паштовай сувязі карыстаецца на ім не меншым попытам, чым усё астатнія. Дзякуючы загадчыцы Дзіне Кузмянковай, якая напярэдадні свята правяла актыўную кампанію, каля стала з друкаванай прадукцыяй увесь час было шматлюдна. З першых хвілін адчувалася, што ў горадзе жыве шмат прыхільнікаў «Звязды». Яшчэ не паспела дастаць з пакета падарункі для падпісчыкаў, як сталі падыходзіць павітаца нашы чытачы. Журналіст абласной газеты «Магілёўскія ведамасці» Тацццяна Падліпская прызналася, што з задавальненнем чытае звяздоўскія артыкулы, а фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук наогул для яе ўзор для пераймання. Спецыяльна павітацца з карэспандэнтам «Звязды» прыйшла і Галіна Цыганкова, адказны сакратар раённай газеты «Родная ніва» — наша пастаянная і адданая падпісчыца на працягу больш як 20 гадоў. «Звязду» люблю за тое, што ў ёй шмат чаму можна павучыцца, а заадно праверыць, наколькі добра ведаю беларускую мову», — кажа чытачка. Ёй вельмі падабаецца рубрыка Валянціны Доўнар «Алё, народ на провадзе», прызнаецца, што і ў сваёй газеце вядзе падобную старонку пад назвай «Субацея». Шмат пастаянных чытачоў «Звязды» сярод супрацоўнікаў пошты. Падпісчыкам газеты чарговы раз стала начальнік паштовага вузла Дзіна Кузьмянкова. «Газета насычаная, шмат карыснай інфармацыі», — растлумачыла яна свой выбар.



Сярод супрацоўнікаў клімавіцкай пошты шмат прыхільнікаў «Звязды».



Пётр Грышанаў стаў падпісчыкам «Звязды».

Падчас свята паспеў зрабіць заказ на паўгадавую падпіску «Звязды» старшыня райсавета Васіль Захаранка. У дэпутацкай рабоце яна першы дарадчык і памочнік. Падпісацца на «Звязду» вырашыў і старшыня Клімавіцкага раённага аб'яднання прафсаюзаў Пётр Грышанаў. Запэўніў, што газеты звычайна чытае ад коркі да коркі і яму ўсё цікава — пачынаючы ад навін, заканчваючы анекдотамі.

Адной з радасных для раёна і газеты падзей, якія адбыліся ў гэтыя святочныя дні ў Клімавічах, стала наваселле раённай бібліятэкі імя Івана Пехцерава. Яна пераехала ў больш камфортны і прасторны будынак, дзе раней размяшчалася раённая інспекцыя па падатках і зборах. Гэтаму пасадзейнічаў клімаўчанін Іван Кажамяка, начальнік інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па Магілёўскай вобласці. У бібліятэчным фондзе налічваецца 35 тысяч кніг і шмат перыёдыкі, сярод якой і наша газета. Гэта значыць, што чытачоў у «Звязды» стане яшчэ больш.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■ І мы там былі

# ВЕЛЬМІ СКЛАДАНА?.. А ВЫ ШТО ХАЦЕЛІ?

## У Нацыянальнай бібліятэцы прайшла «Агульная дыктоўка»

**Успомніць правілы беларускай мовы і праверыць сваю пісьменнасць маглі ўсе ахвотныя — дастаткова было зарэгістравацца на сайце арганізатара.**

Тых, хто суботняй раніцай адклаў справы і знайшоў пару гадзін, каб наведаць малую залу Нацыянальнай бібліятэкі, аказалася больш за тры сотні. Сярод іх апынулася (па ініцыятыве дачкі-сямікласніцы) і аўтар гэтых радкоў. У мінулым годзе, дарэчы, работы пісалі 176 чалавек.

— Мы праводзім «Агульную дыктоўку» ўжо другі год, — расказвае **спецыяліст па карпарацыйных камунікацыях ААТ «Лідскае піва» Надзея НІКАЛАЕВА.** — І зноў лета, і зноў субота, але, як ні дзіўна, людзей прыходзіць шмат. Прыемна, што наш сацыяльны праект па пашырэнні ўжывання беларускай мовы выклікае такую цікавасць.

Пераважная большасць удзельнікаў — моладзь, але прыйшлі і пажылыя людзі, і бацькі з дзецьмі-школьнікамі. Адным з самых юных удзельнікаў, дарэчы, сёлета стаў другакласнік. Праўда, здаўся ён на другой палове тэксту — усё ж разлічаная дыктоўка на падрыхтаваную аўдыторыю.

— Падніміце рукі, хто летась пісаў дыктоўку, — запытаў у залы **вядучы мерапрыемства і тэлеканала АНТ Іван ПАДРЭЗ.** Сярод удзельнікаў такіх аказалася нямала. — А цяпер падніміце рукі тыя, хто напісаў яе добра і атрымаў падарункі! — Былі і такія.

На гэты раз у якасці тэксту абралі ўрывак з пакуль не апублікаванай пятай кнігі гісторыка-прыгодніцкага цыкла Людмілы Рублеўскай «Авантуры Вырвіча з банды Чорнага Доктара».

— Я толькі што скончыла свой чарговы раман, і сёння вы пачуеце кавалак новых прыгод маіх герояў, — павітала прысутных са сцэны Людміла Рублеўская. — І магчыма, хтосьці з вас зацікавіцца не толькі мовай, але і беларускай гісторыяй, і сучаснай беларускай літаратурай.

У якасці дыктара гэты раз выступіла спявачка, актрыса і трэнер па голасе Руся.

— Па шчырасці, гэты тэкст — такі кайф, кожнае слова хочацца смакаваць у роце. Не стрэсуйце, атрымлівайце асалоду, — падбадзёрыла яна ўдзельнікаў і пачала дыктоўку. — *«Да двухпавярховай камяніцы, што тулілася падазрона наводдаль людных вуліц і пляцаў, і кволай сцяжынкі па снезе не пракалі...»*



Пісьменніца Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Тэкст аказаўся і сапраўды насычаны выразамі і словамі, якія не кожны дзень ужываеш: «шаргатлівая лавіна», «замова, уцямная толькі пасведчаным», «блюзнерскія выданні», «дыхтоўная мэбля», «грувасцілася папяровымі гарамі» і «іншыя цікавосткі»... Дыялогі і іх афармленне часам ставілі ў тупік некаторых удзельнікаў.

— Вельмі складаны тэкст, — прызналася Руся, зал пагадзіўся і адказаў апладысментамі. — А што ж вы хацелі? «Прыляцелі гракі» вы і самі напішаце, — пажартавала актрыса.

— Усе выпраўленні будуць залічаныя на вашу карысць. А чырвоны радок увогуле памылкай не лічыцца, — супакойвалі ўдзельнікаў выкладчыкі. — У тэксце шмат аўтарскіх знакаў прыпынку, і мы прадугледзелі ўсю варыятыўнасць напісання.

Праверыць тэксты, дарэчы, філалагічная камісія, якая складаецца з выкладчыкаў ВНУ. У нацыянальнай бібліятэцы работы напісалі 304 чалавекі, яшчэ 17 дыктовак даслалі пасля — далучыцца да ўдзельнікаў можна праз трансляцыю на YouTube-канале: напісаць тэкст дома і даслаць яго на электронную пошту. Канчатковыя вынікі стануць вядомы 8 чэрвеня. Пакуль праверана невялікая частка работ, але, як прызнаюцца арганізатары, «дзясяткі» ўжо ёсць. Свае адзнакі кожны ўдзельнік атрымае на электронную пошту, а выдатнікі атрымаюць яшчэ і падарункі ад ААТ «Лідскае піва».

***P. S.*** *«Словы нескладаныя, а вось са знакамі прыпынку — жах», — такую выснову пасля дыктоўкі зрабіла дачка. Згодная, мая дарагая, таму падарункаў па пошце не чакаем.*

**Алена КРАВЕЦ**



Фота партала TUT.BY

Карэспандэнт «Звязды» *(у першым радзе злева)* падчас «Агульнай дыктоўкі».

■ Літаратурныя сустрэчы

# Пра што не казалі ў школе?

### Амаль 400 слухачоў наведалі лекцыі «БелЛіт: мабільны гід»

**Серыя бясплатных публічных лекцый праводзілася з сакавіка па май. 23 удзельнікі, якія праслухалі больш за пяць лекцый, атрымалі дыпломы выдатнікаў і падарункі.**

Як заўважыў мадэратар праекта паэт Андрэй Хадановіч, фармат адкрытых лекцый становіцца сёння ўсё больш запатрабаваным. З аднаго боку, спікеры гаварылі пра важныя і глыбокія тэмы, а з іншага, знаходзілі прыёмы рабіць гэта забаўна, харызматычна і даступна. Безумоўна, падобныя лекцыі спрыяюць пашырэнню кругагляду: кожны мог адкрыць для сябе новыя імёны.

Праект «БелЛіт: мабільны гід» ладзіўся пры падтрымцы Мабільнай бібліятэкі МТС. Гідамі па літаратурным свеце для слухачоў сталі Альгерд Бахарэвіч, Юлія Цімафеева, Алесь Суша, Вальжына Морт, Ганна Севярынец, Андрэй Хадановіч, Ганна Бутырчык, Марына Казлоўская. Спікеры гаварылі пра выдатных гераінь беларускай літаратуры, паспяховы стартап XVI стагоддзя Францыска Скарыны, пра гістарычныя і літаратурныя факты, якіх няма ў школьнай праграме.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды помещений**

Лот № 1. **Право заключения договора аренды помещений общей площадью 40,1 (в т. ч. 33,4; 1,3; 1,6; 3,8) кв. м, расположенных на первом этаже капитального строения с инв. № 700/С-14699 – здание районного узла почтовой связи,** по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 149. Право аренды предоставляется сроком на пять лет.

**Начальная цена продажи права: 161,50 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка 16,15 бел. руб.**

| | |
|---|---|
| **Продавец** | Могилевский филиал РУП «Белпочта, УНП 700838286, г. Могилев, ул. Первомайская, 28 |
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 10 июля 2018 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 9 июля 2018 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона права** | В течение 5 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона победитель перечисляет на расчетный счет Продавца цену продажи предмета аукциона за вычетом задатка |

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юридические лица Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации, копии учредительных документов, индивидуальные предприниматели Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц и индивидуальных предпринимателей – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранные индивидуальные предприниматели – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представители иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованную в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник, выигравший торги, уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона, в соответствии с выдаваемым в день проведения аукциона счетом-фактурой.

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 222 72-41-14, +375 29 624-26-25, +375 44 738-18-99**

---

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительными**: квитанции 1-СУ серии СВ №№ 0611451, 2285489, 2285490, договор страхования серии ПЕ № 0219302.

---

Утерянный бланк строгой отчетности серии БЛБ № 2178604 «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» страховой компании БРУСП «Белгосстрах» представительства по Борисовскому району **считать недействительным.**

УНП 100122726

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1:** капитальное строение, инв. № 422/С-3785 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – производственная контора), обшей площадью 456,3 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, а. г. Лещанка, ул. Молодежная, 1

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 425883503605000029, площадью 0,2168 га (назначение – содержание и обслуживание здания конторы), расположенном по адресу: Щучинский р-н, а. г. Лещанка, ул. Молодежная, 1. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: ограничения, устанавливаемые в отношении недвижимого имущества, находящегося в водоохранных зонах водного объекта, площадью 0,2168 га

Обременения со стороны третьих лиц – часть здания площадью 100,5 кв. м передано в безвозмездное пользование по договору сроком до 31.12.2019 г.

Начальная цена продажи – 34 184,08 руб. (тридцать четыре тысячи сто восемьдесят четыре рубля восемь копеек) с учетом НДС

Сумма задатка – 3 418 руб. (три тысячи четыреста восемнадцать рублей)

Продавец – ОАО «Щучинагрохимсервис», 231513, г. Щучин, ул. Ленина, 37, тел. 8-01514-242-62

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 25 июня 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.
В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов.
Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 13.04.2018 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 19 июня 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*http://grodnoino.by*

---

### К публикации Коммунального топографо-геодезического унитарного предприятия «ГОМЕЛЬГЕОДЕЗЦЕНТР» о проведении аукциона по продаже земельных участков в частную собственность в г. Гомеле № 6-С/2018, который состоится 20 июня 2018 г. (объявление опубликовано в газете «Звязда» 15 мая 2018 г.), добавляется лот № 8 в следующей редакции:

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Начальная стоимость, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Затраты на подготовку документации, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 8 | В районе пер. Виноградного 3-го и пер. Виноградного 4-го (участок № 1) | 340100000002006050 | 0,0791 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Охранная зона электрических сетей | 11 581,17 | 400,00 | 2 494,23 |

Лот № 8 выставляется на аукцион повторно, извещение опубликовано 02.03.2018 г. в газете «Звязда»

**Контактный телефон +375 232 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.qomel.qov.by либо geodezcentr.by** УНП 400230163

---

### Извещение об открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Гроднопромстрой», расположенного по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 115 10 июля 2018 года

| | |
|---|---|
| Вид аукциона открытый | |
| Предмет аукциона | Капитальные строения:<br>– инвентарный номер 400/С-81527 (караульное помещение) общей площадью 15,0 кв. м (1-этажное каркасно-засыпное здание. Год постройки – 1970);<br>– инвентарный номер 400/С-81529 (склад ГСМ) общей площадью 21,0 кв. м (1-этажное здание. Материал стен – силикатные блоки. Год постройки – 1970);<br>– инвентарный номер 400/С-81530 (склады со встроенными гаражами) общей площадью 632,0 кв. м (2-этажное здание. Материал стен – кирпич. Год постройки – 1970);<br>– инвентарный номер 400/С-81531 (гараж) общей площадью 274,1 кв. м (1-этажное здание. Материал стен – кирпич. Год постройки – 1970);<br>– инвентарный номер 400/С-81532 (навес) общей площадью 179,8 кв. м (1-этажное здание. Материал стен – кирпич. Год постройки – 1970);<br>– инвентарный номер 400/С-81536 (ограждение) общей площадью 349,3 кв. м (металлическая сетка, бетонный забор. Год постройки – 1970);<br>– водопроводная сеть дворовая длиной 30,6 м;<br>– канализация ливневая длиной 87,0 м;<br>– канализация фекальная длиной 200,0 м |
| Начальная цена продажи | **520 931,50 рублей** (с учетом НДС 20%) |
| Кадастровый номер земельного участка и размеры | 440100000002003502 площадью 0,3913 га |
| Месторасположение земельного участка | г. Гродно, ул. Максима Горького, 115 |
| Продавец | Открытое акционерное общество «Гроднопромстрой», г. Гродно, проспект Космонавтов, д. 52, тел.: 744108, 744127 |
| Имущественное право земельного участка | Право аренды |
| Сумма задатка | 52 093,15 рублей |
| Организатор аукциона | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел.: 742095, 720537, 720546. |
| Дата проведения аукциона | **10 июля 2018 года** |
| Время проведения аукциона | 12.00 |
| Место проведения аукциона | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 |
| Дата и время начала приема документов | 11 июня 2018 года 8.00 |
| Дата и время окончания приема документов | 4 июля 2018 года 17.00 |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Адрес сайта: www.grodno.gov.by

---

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
31.05.2018 г.
Красинский А. Д.

УТВЕРЖДЕНО
Внеочередным Общим собранием
акционеров ЗАО «Топзапэлектро»
(протокол б/н от 14 мая 2018 года)

**ИЗМЕНЕНИЯ**
**в проспект эмиссии жилищных облигаций десятого выпуска Закрытого акционерного общества «ТОПЗАПЭЛЕКТРО»**, утвержденного внеочередным Общим собранием акционеров ЗАО «Топзапэлектро»
(протокол б/н от 20 декабря 2017 года)

**1. Подпункт 2.4.3. пункта 2.4. изложить в следующей редакции:**

2.4.3. Архитектурный проект согласован Комитетом архитектуры и градостроительства Мингорисполкома (заключение № 12-28/1386М от 28.12.2015). Положительное заключение государственной экспертизы РУП «Главгосстройэкспертиза» по проектной документации Объекта от 07.04.2016 № 55-15/16. Положительное заключение государственной экспертизы РУП «Главгосстройэкспертиза» по проектной документации Объекта от 02.05.2018 № 133-15/18 в дополнение к заключению государственной экспертизы от 07.04.2016 № 55-15/16.

**2. Часть вторую подпункта 2.4.5. пункта 2.4. изложить в следующей редакции:**

Нормативный срок продолжительности строительства – 31,0 месяц, в том числе подготовительный период – 1 месяц.

**3. Подпункт 2.4.7. пункта 2.4. изложить в следующей редакции:**

2.4.7. Строящийся жилой дом расположен в Московском районе г. Минска, не относится к категории повышенной комфортности. Конструктивная схема здания – 1-секционный 22-этажный жилой дом с цокольным и техническими этажами, к которому примыкают пристроенные помещения жилого дома № 22 по генплану и паркинг № 21а по генплану.

Жилой дом № 21 по г/п – 22-этажный, односекционный, на 207 квартир с цокольным и техническим этажами. В части цокольного и первого этажа запроектированы встроенные помещения торгового и общественного назначения с отдельными входами. Несущая система жилого дома запроектирована в монолитном железобетонном рамно-связевом каркасе, состоящем из монолитных железобетонных колонн, монолитных железобетонных стен и жестко сопряженных с ними монолитных дисков перекрытий. Лестничные марши сборные железобетонные. Фундаменты – сплошная монолитная железобетонная плита на естественном основании толщиной 1200 мм. Цокольные стены – железобетонные монолитные толщиной 250 мм.

Общая площадь квартир в жилом доме № 21 – 11 456,84 кв. м.

Генеральный директор
Закрытого акционерного общества
«Топзапэлектро» Д. В. Новиков

Главный бухгалтер
Закрытого акционерного общества
«Топзапэлектро» М. Л. Гришилова

УНП 100896485

---

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
31.05.2018 г.
Красинский А. Д.

УТВЕРЖДЕНО
Внеочередным Общим собранием
акционеров ЗАО «Топзапэлектро»
(протокол б/н от 14 мая 2018 года)

**ИЗМЕНЕНИЯ**
**в проспект эмиссии жилищных облигаций девятого выпуска Закрытого акционерного общества «ТОПЗАПЭЛЕКТРО»**, утвержденного внеочередным Общим собранием акционеров ЗАО «Топзапэлектро»
(протокол б/н от 18 июля 2017 года)

**1. Подпункт 2.4.3. пункта 2.4. изложить в следующей редакции:**

2.4.3. Архитектурный проект согласован Комитетом архитектуры и градостроительства Мингорисполкома (заключение № 12-28/1386М от 28.12.2015). Положительное заключение государственной экспертизы РУП «Главгосстройэкспертиза» по проектной документации Объекта от 07.04.2016 № 55-15/16. Положительное заключение государственной экспертизы РУП «Главгосстройэкспертиза» по проектной документации Объекта от 02.05.2018 № 133-15/18 в дополнение к заключению государственной экспертизы от 07.04.2016 № 55-15/16.

**2. Часть вторую подпункта 2.4.5. пункта 2.4. изложить в следующей редакции:**

Нормативный срок продолжительности строительства – 31,0 месяц, в том числе подготовительный период – 1 месяц.

**3. Подпункт 2.4.7. пункта 2.4. изложить в следующей редакции:**

2.4.7. Строящийся жилой дом расположен в Московском районе г. Минска, не относится к категории повышенной комфортности. Конструктивная схема здания – 1-секционный 22-этажный жилой дом с техническим подпольем и теплым техническим чердаком.

Жилой дом № 22 по г/п – 22-этажный, односекционный, на 207 квартир с техническим подпольем и теплым техническим чердаком. В части цокольного и первого этажей запроектированы встроенные помещения торгового и общественного назначения с отдельными входами, а также пристроенные помещения, в которых предусмотрено размещение физкультурно-оздоровительного центра. Несущая система жилого дома запроектирована в монолитном железобетонном рамно-связевом каркасе, состоящем из монолитных железобетонных колонн, монолитных железобетонных стен и жестко сопряженных с ними монолитных дисков перекрытий. Лестничные марши – сборные железобетонные. Фундаменты – сплошная монолитная железобетонная плита на естественном основании толщиной 1200 мм. Цокольные стены – железобетонные монолитные толщиной 250 мм.

Общая площадь квартир в жилом доме № 22 – 11 446,05 кв. м.

Генеральный директор
Закрытого акционерного общества
«Топзапэлектро» Д. В. Новиков

Главный бухгалтер
Закрытого акционерного общества
«Топзапэлектро» М. Л. Гришилова

УНП 100896485

---

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
31.05.2018 г.
Красинский А. Д.

УТВЕРЖДЕНО
Внеочередным Общим собранием
акционеров ЗАО «Топзапэлектро»
(протокол б/н от 14 мая 2018 года)

**ИЗМЕНЕНИЯ**
**в проспект эмиссии жилищных облигаций восьмого выпуска Закрытого акционерного общества «ТОПЗАПЭЛЕКТРО»**, утвержденного внеочередным Общим собранием акционеров ЗАО «Топзапэлектро»
(протокол б/н от 6 октября 2016 года)

**1. Подпункт 2.4.3. пункта 2.4. изложить в следующей редакции:**

2.4.3. Архитектурный проект согласован Комитетом архитектуры и градостроительства Мингорисполкома (заключение № 12-28/1386М от 28.12.2015). Положительное заключение государственной экспертизы РУП «Главгосстройэкспертиза» по проектной документации Объекта от 07.04.2016 № 55-15/16. Положительное заключение государственной экспертизы РУП «Главгосстройэкспертиза» по проектной документации Объекта от 02.05.2018 № 133-15/18 в дополнение к заключению государственной экспертизы от 07.04.2016 № 55-15/16.

**2. Подпункт 2.4.4. пункта 2.4. дополнить частью третьей:**

«Нормативный срок продолжительности строительства – 31,0 месяц, в том числе подготовительный период – 1 месяц.

**3. Подпункт 2.4.6. пункта 2.4. изложить в следующей редакции:**

2.4.6. Строящийся жилой дом расположен в Московском районе г. Минска, не относится к категории повышенной комфортности. Конструктивная схема здания – 1-секционный 22-этажный жилой дом с техническим подпольем и теплым техническим чердаком.

Жилой дом № 22 по г/п – 22-этажный, односекционный, на 207 квартир с техническим подпольем и теплым техническим чердаком. В части цокольного и первого этажей запроектированы встроенные помещения торгового и общественного назначения с отдельными входами, а также пристроенные помещения, в которых предусмотрено размещение физкультурно-оздоровительного центра. Несущая система жилого дома запроектирована в монолитном железобетонном рамно-связевом каркасе, состоящем из монолитных железобетонных колонн, монолитных железобетонных стен и жестко сопряженных с ними монолитных дисков перекрытий. Лестничные марши – сборные железобетонные. Фундаменты – сплошная монолитная железобетонная плита на естественном основании толщиной 1200 мм. Цокольные стены – железобетонные монолитные толщиной 250 мм.

Общая площадь квартир в Жилом доме № 22 – 11 446,05 кв. м.

Генеральный директор
Закрытого акционерного общества
«Топзапэлектро» Д. В. Новиков

Главный бухгалтер
Закрытого акционерного общества
«Топзапэлектро» М. Л. Гришилова

УНП 100896485

КАРАНІ І КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда»
і Міністэрства прыродных рэсурсаў
і аховы навакольнага асяроддзя

№ 4 (32)

Андрэй ХУДЫК:

# «Стаўленне да экалогіі становіцца больш свядомым»

## Пра забруджванне прыроды, узнаўляльную энергію і экалагічнае выхаванне

**Хто дапамог Белгідрамету зрабіць магутны рывок у будаўніцтве новых метэастанцый? Што трэба, каб беларускія гарады сталі зялёныя, а землі — чыстыя? Пра гэта і многае іншае напярэдадні Дня навакольнага асяроддзя расказаў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

### ВАЖНЕЙ ЗА ЎСЁ — ПРАГНОЗ НАДВОР'Я

***— Андрэй Паўлавіч, прызначаючы вас на пасаду ў верасні мінулага года, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка паставіў некалькі задач першачарговай важнасці. Як яны вырашаюцца?***

— Зрухі ёсць па ўсіх кірунках. Найбольш складаная задача — гэта развіццё мінеральна-сыравіннай базы. У нас няма права на памылку, таму павышаная ўвага ўдзяляецца якасці геолагаразведкі. Мэтазгоднасць здабычы таго ці іншага віду сыравіны ў цяперашні момант дыктуе эканоміка.

Прэзідэнт пагадзіўся з нашымі падыходамі адносна ўдасканалення работы Белгідрамета. Мы атрымалі сур'ёзную фінансавую падтрымку, дзякуючы якой будуем адну з самых сучасных гідраметэастанцый у Мінску; у маі адкрылі аўтаматычныя станцыі ў Лепелі і Пружанах; да канца года з'явяцца новыя станцыі ў Гродне, Шчучыне, Салігорску і Полацку. Зараз ідзе сур'ёзная падрыхтоўка, і ў наступным годзе ў Віцебску пачне працаваць доплераўскі лакатар — сучаснае абсталяванне паспрыяе дакладнасці прагнозаў. Ніколі за апошнія гадоў дваццаць у Белгідрамеце столькі не рабілася на працягу аднаго года. Максімальна высокая ступень апраўдвальнасці прагнозаў надвор'я неабходная для грамадства і для эканомікі. Сёння ў гэтым кірунку шмат зроблена, але няма мяжы дасканаласці, і нам ёсць дзе прыкласці намаганні і над чым працаваць.

Трэцяя задача датычыцца навядзення парадку на зямлі. У сталіцы, абласных і раённых цэнтрах пытанняў практычна няма — усё добраўпарадкавана і акультурана. А вось у сельскай мясцовасці пакуль не ўсё і не ўсюды ў гэтым плане добра. Асаблівую ўвагу неабходна ўдзяляць так званым неперспектыўным вёскам, у якіх засталося некалькі жыхароў. Трэба вырашаць пытанні з хатамі, якія ніхто не дагледзіць, а гэта юрыдычна не заўсёды проста. Лепш за ўсё, каб неперспектыўныя вёскі змянілі свой статус і пачалі развівацца. Гэтаму могуць садзейнічаць і дачнікі, купляючы там хаты. Таксама прадпрымальнікам варта смялей ісці ў глыбінку — дзякуючы Дэкрэту № 7 перашкод няма.

### ВАДА... НА ЭКСПАРТ

***— Адзін час у прэсе была папулярная тэма экспарту беларускіх слімакоў. А якая яшчэ, скажам так, цікавая і незвычайная прадукцыя адпраўляецца за мяжу?***

— Да гэтай катэгорыі адносяцца 9 відаў дзікіх жывёл: вінаградны слімак, лічынкі хіранамід, тры віды жаб, гадзюка звычайная, даўгапалы рак, паласаты рак і ўсходняя рачная крэветка. Акрамя слімакоў, найбольш шырока выкарыстоўваюцца ў гаспадарчых мэтах даўгапалы рак і лічынкі хіранамід, аб'ёмы экспарту якіх у 2017 годзе ўзраслі ў параўнанні з 2016-м у 2,3 раза.

***— А якія экспартныя перспектывы вады?***

— Ключавы момант — якасць. Ёсць праблема, ад якой нікуды не дзенешся, — павышанае ўтрыманне жалеза. Прадпрыемствы па разліве бутыляванай вады часцяком будуюцца бліжэй да буйных гарадоў (напрыклад, Мінска), дзе такая праблема — не рэдкасць. У большасці выпадкаў побач са свідравінамі даводзіцца ставіць станцыі абезжалезвання, а гэта ўжо хоць і мінімальная, але водападрыхтоўка, а паводле еўрапейскіх стандартаў, такая вада аўтаматычна выключаецца з катэгорыі прыроднай. У найбліжэйшай перспектыве плануем вылучыць і ацаніць участкі, дзе можна весці здабычу без усялякай водападрыхтоўкі на працягу доўгага часу. Інвестарам варта звярнуць увагу на Воранаўскі, Баранавіцкі, Салігорскі, Асіповіцкі, Лельчыцкі і Калінкавіцкі раёны, нягледзячы на тое, што пазначаныя там участкі трэба дадаткова вывучаць. Гэта патрабуе некаторых выдаткаў, таму многім арганізацыям пакуль прасцей і выгадней займацца не здабычай вады, а яе аднаўленнем.

### БОЙ ПЛАСТЫКУ І ЭНЕРГІЯ ВЕТРУ

***— Выкарыстанне якіх відаў аднаўляльных крыніц энергіі вы лічыце найбольш перспектыўным у Беларусі?***

— Краіна ўсё больш актыўна выкарыстоўвае магчымасці альтэрнатыўных крыніц энергіі. Дастаткова сказаць, што ў нас ёсць раёны, як, напрыклад, Навагрудскі, дзе чвэрць (!) энергіі для спажыўцоў дае вецер.

На Гродзеншчыне, Магілёўшчыне таксама працуюць магутныя станцыі, здольныя забяспечыць электрычнасцю горад-дзесяцітысячнік. Гэта даволі перспектыўны кірунак, які мы будзем развіваць.

*(Заканчэнне на 8-9–й стар.)*

**Дарагія сябры, калегі!
Паважаныя суайчыннікі і госці нашай Беларусі!**

Шчыра віншую вас з цудоўным святам — Днём аховы навакольнага асяроддзя!

Гэта свята аб'ядноўвае работнікаў прыродаахоўных ведамстваў, прамысловых эколагаў, прадстаўнікоў грамадскіх экалагічных арганізацый, навукоўцаў, педагогаў і ўсіх неабыякавых людзей у нашай краіне.

Дзень аховы навакольнага асяроддзя з'яўляецца напамінам пра тое, што мы самі адказныя за экалагічную бяспеку нашай роднай Беларусі, захаванасць яе ўнікальнай прыроды, чысціню шматлікіх рэк і азёр, лясоў і палёў, за будучыню нашых дзяцей.

Хачу выказаць падзяку эколагам-прафесіяналам і абаронцам навакольнага асяроддзя, жыхарам вялікіх гарадоў і маленькіх вёсак за неабыякавасць і клопат пра наш агульны дом. Няхай гэтае свята будзе адзначана радасцю і бадзёрым настроем, а таксама стане сімвалам дабра і росквіту.

Разам мы зробім прыроду нашага роднага краю яшчэ больш прыгожай і багатай, што паспрыяе душэўнаму камфорту, моцнаму здароўю і дабрабыту людзей.

**Андрэй ХУДЫК,
міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.**

■ Прыроднае багацце

# Балоты — наш брэнд і здабытак

**Беларускія балоты па праве называюць лёгкімі Еўропы, бо яны выводзяць з атмасферы сотні тысяч тон вуглякіслага газу. Нашы балоты ўнікальныя яшчэ і тым, што нямала іх захавалася ў натуральным ці блізкім да яго стане.**

*(Заканчэнне на 10-й стар.)*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Нябачная пагроза

# МІКРАПЛАСТЫК НА ТАЛЕРЦЫ

**Рознакаляровыя бліскаўкі ў гелі для душу або ружовыя гранулы ў клубнічным скрабе — каго не прывабіць гэта маркетынгавая хітрасць? Але ў выніку гэтыя маленькія шарыкі трапляюць у каналізацыю, а пасля сплываюць і ў Сусветны акіян, дзе іх з'ядаюць рыбы і іншыя марскія жывёлы, а праз іх — да чалавека. Што гэта за загадкавыя часціцы, і чаму яны так хвалююць эколагаў?**

### ШТО Ў КАСМЕТЫЧЦЫ?

Сёння пластык усюды. Танны і практычны, ён усё шчыльней уваходзіць у жыццё спажыўца. Спакуса яшчэ больш зменшыць цану на тавар штурхнула вытворцаў касметыкі да-



лей — рабіць з пластыку не толькі ўпакоўку, але і змесціва прадукту.

— Колькасць мікрапластыку ў складзе касметычнага сродку можа вар'іравацца ад 1 да 90 працэнтаў. Гэта значыць, што звычайны гель для душу ці скраб можа змяшчаць прыкладна столькі ж пластыку, колькі ідзе на вытворчасць яго ўпакоўкі, — адзначыла **супрацоўнік Цэнтра экалагічных рашэнняў Марыя СУМА.**

Выходзіць, што загадкавыя рознакаляровыя гранулы ў скрабе, гелі для душу або зубной пасце — гэта не што іншае, як мікрапластык. Але не заўсёды, вядома. Ён лёгка замяняецца костачкамі абрыкоса, клубніц, маліны ці натуральнымі валокнамі люфы.

— Самае галоўнае правіла пры выбары касметыкі — уважліва чытаць састаў, — падкрэсліла эксперт. — Існуе спіс мікрапластыку, які часцей за ўсё сустракаецца ў беларускай касметыцы. Але на самай справе ён значна шырэйшы. Некаторыя міжнародныя арганізацыі называюць мікрапластыкам цэлыя 67 палімераў (азнаёміцца са спісам можна па спасылцы http://www.beatthemicrobead.org/product-lists/).

*(Заканчэнне на 10-й стар.)*

# Навука для старацеляў з Афрыкі

**Нядаўна ў Мінску прайшлі курсы павышэння кваліфікацыі па геалагічным картаванні, арганізаваныя Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі. Іх прайшлі прадстаўнікі кіруючага апарата, начальнікі аддзелаў, якія адказваюць за касмічнае картаванне, за арганізацыю праектаў па здабычы і выкарыстанні карысных выкапняў Міністэрства мінеральных рэсурсаў Судана. З якой мэтай былі арганізаваны гэтыя курсы, якія далейшыя планы афрыканскай рэспублікі адносна нашай краіны?**



**Начальнік галоўнага ўпраўлення прыродных рэсурсаў Мінпрыроды Сяргей МАМЧЫК** расказаў, што спецыялісты з Судана прайшлі тэарэтычную і практычную часткі курсаў з выездамі на месцы.

— Курсы былі арганізаваны па ініцыятыве суданскага боку, якая была ім выказана падчас леташняга візіту дэлегацыі нашага міністэрства. Маючы вялікі вопыт у сферы геалагічнага картавання, мы расказалі аб тым, як працуе гэтая сістэма ў нашай краіне на кожным этапе збору геалагічнай інфармацыі (атрыманне касмічных здымкаў, іх апрацоўка, праверка даных у палявых умовах, складанне картаў з дапамогай сучасных ГІС-тэхналогій).

Спецыялісты з Судана зацікавіліся і арганізацыяй работы па ахове аб'ектаў для турызму ў Беларусі, паколькі сёння яны актыўна развіваюць новую праграму геапаркаў. Мы правялі гасцей па экалагічнай сцежцы заказніка «Налібоцкі», паказалі шмат цікавых месцаў, распавялі пра меры па ахове жывёльнага і расліннага свету.

Падчас праходжання курсаў госці наведалі РУП «ВА «Беларуснафта» Інстытута «БелНДПІнафта» ў Гомелі. Там на высокім узроўні знаходзіцца вывучэнне горных парод, а таксама захоўваюцца многія экзэмпляры (цікава, што керн захоўваецца на вышыні 4-павярховага дома), якія дастаюць па QR-кодзе.

Судан — краіна, якая гістарычна актыўна займаецца здабычай золата. Праблема ў тым, што золата ў гэтай краіне змяшчаецца ў рудзе ў дробнай фракцыі («пыляватае» золата). Для таго каб яго здабыць з пароды, неабходна выцягнуць пустую пароду, атрымаць канцэнтрат. З гэтага канцэнтрату звычайна золата атрымліваюць шляхам амальгамавання (метад здабывання металаў з руд растварэннем у ртуці). Гэта небяспечна як для прыроды, так і для здароўя старацеляў. З мэтай змены тэхналогіі госці наведалі ААТ "НВА Цэнтр", дзе ім расказалі пра бязртутнае абагачэнне парод, у якіх змяшчаецца золата, і якое можа прымяняцца і ў Судане.

Для афрыканскай дэлегацыі было важна азнаёміцца з нашымі геаінфармацыйнымі тэхналогіямі, атрыманнем касмічных здымкаў, паколькі гэта асноўная крыніца геаінфармацыі ў Судане сёння. Здымкі беларускага касмічнага апарата цяпер складуць канкурэнцыю амерыканскім і кітайскім. Гасцей зацікавілі і іншыя тэхналогіі па здабычы солі, рудных і каштоўных металаў, рэдказямельных элементаў, храмітаў.



**Намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Аляксандр КОРБУТ** выказаў спадзяванне, што ў далейшым такія курсы будуць праходзіць на пастаяннай аснове:

— Мы атрымалі спрыяльны вопыт для двух краін і паклалі пачатак вялікага супрацоўніцтва. За гэты кароткі час немагчыма паказаць усе славутыя мясціны краіны, але мы спадзяёмся, што госці атрымалі ўяўленне аб нашай зямлі, сфарміравалі добрае ўражанне.

**Вольга ПРАЛЮК.**

# «Стаўленне да экалогіі становіцца больш свядомым»

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Можа, кагосьці гэта здзівіць, але першая атамная энергія, якую мы атрымаем пасля ўводу ў эксплуатацыю БелАЭС, — таксама «зялёны» праект, бо дазволіць нам знізіць выкіды парніковых газаў больш чым на 7 мільёнаў тон. Дарэчы, гэта толькі 25 % ад пастаўленай перад намі задачы, таму яшчэ шмат намаганняў трэба прыкласці ў гэтай сферы.

Зразумела, што наша краіна, памятаючы пра горкія ўрокі Чарнобыля, робіць усё магчымае, каб на самым высокім узроўні гарантаваць бяспеку атамнай станцыі ў Астраўцы. У гэтым пытанні мы заўсёды адкрыты для супрацоўніцтва з экспертамі профільных міжнародных арганізацый.

«Зялёная» энергія павінна прыйсці ў малыя населеныя пункты — пачынаючы з хутара, невялікай вёскі і заканчваючы райцэнтрамі, дзе няма буйных прамысловых прадпрыемстваў, а значыць, спажыванне энергіі невялікае. У гэтым ёсць логіка. І ў нас такія праекты сумесна з ПРААН рэалізуюцца.

***— Тэма Сусветнага дня навакольнага асяроддзя 2018 года — «Бой забруджванню пластыкам». Паводле даных ААН, каля 40 % пластыку ідзе на выраб рознай упакоўкі. Ці плануецца ў нашай краіне зрабіць захады для скарачэння яго выкарыстання ў таварах (напрыклад, забарона продажу поліэтыленавых пакетаў)?***

— Гэта праблема ўзнятая на ўзроўні ўрада. У прыватнасці, Мінжылкамгасу разам з Мінпрыроды, МАРГ і іншымі зацікаўленымі ведамствамі даручана прапрацаваць пытанне абмежавання выкарыстання поліэтыленавай упакоўкі ў арганізацыях гандлю і выйсці ў Саўмін з канкрэтнымі прапановамі ў найбліжэйшы час. Акрамя таго, сёлета плануецца правесці даследаванні марфалагічнага саставу палімерных адходаў, што ўтрымліваюцца ў ЦКА, з наступным унясеннем ва ўрад прапаноў аб неабходнасці распрацоўкі праграмы па іх другасным выкарыстанні.

## НА ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ СВІСЛАЧЫ — ТРЫ ГАДЫ

***— Кожны год у Беларусі абнаўляюць рэйтынг самых чыстых і самых брудных вадаёмаў. Які ён сёння? І што робіцца, каб сталічная рака Свіслач — «антылідар» апошніх гадоў — стала больш чыстай?***

— Даныя Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя дазваляюць казаць, што колькасць проб з павышаным утрыманнем у іх біягенаў, нафтапрадуктаў і інш. паступова зніжаецца. Наяўнасць проб з утрыманнем жалеза агульнага і медзі, што перавышаюць нарматывы, па-ранейшаму звязана з уздзеяннем прыродных фактараў, якія не паддаюцца рэгуляванню. У прыватнасці, яны павялічыліся таму, што было шмат малаводных перыядаў.

У цэлым пераважная колькасць участкаў вадацёкаў (91,5 %), ахопленых рэгулярнымі назіраннямі, адпавядае «добраму» і «выдатнаму» гідрахімічнаму статусу.

Значную антрапагенную нагрузку адчуваюць 8,5 % паверхневых водных аб'ектаў (іх участкаў) і вадаёмаў не змяніўся, у яго склад уваходзяць: рэкі Свіслач (н. п. Каралішчавічы, Свіслач), Лошыца (г. Мінск), Уза (10 км ПЗ г. Гомеля), Пліса (г. Жодзіна), Заходні Буг і Мухавец (г. Кобрын), Лясная Правая (н. п. Каменюкі), Ясельда (ніжэй г. Бярозы), Морач (н. п. Яськавічы), Уша (ніжэй г. Маладзечна), а таксама азёры Мёрскае, Лядна і Кагальнае, Асіповіцкае вадасховішча. Асноўная прычына павышанай антрапагеннай нагрузкі на паверхневыя водныя аб'екты — як кропкавыя, так і дыфузныя крыніцы забруджвання.

Наконт Свіслачы ёсць адпаведнае распараджэнне Адміністрацыі Прэзідэнта, а Мінскім гарвыканкамам распрацаваны і зацверджаны мерапрыемствы па аздараўленні гэтай ракі і яе прытокаў, а таксама па добраўпарадкаванні тэрыторый, прылеглых да іх. Работы ажыццяўляюцца ў асноўным за кошт сродкаў, прадугледжаных мясцовым бюджэтам і інвестыцыйнай праграмай горада Мінска. Кантроль за рэалізацыяй гэтых мерапрыемстваў Мінгарвыканкам пакінуў за сабой. У адпаведнасці з планам работы павінны быць завершаны да 2021 года.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАБРУДЖВАЛЬНІКІ — НА АБЯСШКОДЖВАННЕ!

***— Якія мерапрыемствы па выкананні палажэнняў Стакгольмскай канвенцыі аб стойкіх арганічных забруджвальніках праводзяцца сёння ў нашай краіне?***

— Для выканання абавязацельстваў, прынятых Беларуссю, рэалізуецца падпраграма 3 «Абыходжанне са стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі» Дзяржпраграмы «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў на 2016—2020 гады».

Сярод асноўных мерапрыемстваў падпраграмы — вядзенне і актуалізацыя Адзінай базы даных аб САЗ (яна ўтрымлівае інфармацыю пра пестыцыды, аб'екты іх размяшчэння і забруджаныя імі тэрыторыі, крыніцы выкідаў САЗ у выніку іх ненаўмыснай вытворчасці, пра колькасны састаў САЗ у аб'ектах навакольля). Акрамя таго, праводзіцца маніторынг гэтых рэчываў у кампанентах прыроднага асяроддзя; вядзецца работа па ўдасканаленні сістэмы ўліку выкідаў САЗ; рэалізуецца комплекс мерапрыемстваў па перапакаванні і вывазе на даўгачаснае захоўванне для далейшага абясшкоджвання непрыдатных пестыцыдаў Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцей; ідзе працэс ліквідацыі Петрыкаўскага захавання непрыдатных пестыцыдаў і інш.

На базе КУП «Комплекс па перапрацоўцы і захаванні таксічных прамысловых адходаў Гомельскай вобласці» плануецца стварыць стратэгічна важны для нашай краіны аб'ект абясшкоджвання небяспечных (таксічных) адходаў, на якім будзе адбывацца іх канчатковае знішчэнне.

***— Сёння вельмі актуальная праблема ўтылізацыі медыцынскіх адходаў...***

— Гэта пытанне знаходзіцца пад кантролем Мінпрыроды і Міністэрства аховы здароўя. На пачатку года адбылося сумеснае пасяджэнне калегій двух ведамстваў, дзе абмяркоўвалася выкананне заканадаўства аб абыходжанні з небяспечнымі медыцынскімі адходамі.

Гэты від адходаў значна адрозніваецца ад іншых адходаў і патрабуе асаблівай увагі, што абумоўлена наяўнасцю ў іх складзе ўзбуджальнікаў розных інфекцыйных захворванняў і таксічных рэчываў. Аб'ёмы іх утварэння растуць штогод. Так, за перыяд з 2012-га да 2017 года гэты паказчык павялічыўся больш чым у тры разы (у 2016-м іх утварылася 16,9 тыс. т).

Для рашэння праблемы неабходна ідэнтыфікаваць небяспеку медыцынскіх адходаў для здароўя людзей і наваколля, а таксама выключыць трапанне неабясшкоджаных іх частак на захаванне. Мы таксама працуем над удасканаленнем заканадаўчай базы. Спецыялісты двух ведамстваў прынялі ўдзел у распрацоўцы новай рэдакцыі санітарных нормаў і правілаў «Правілы абыходжання з медыцынскімі адходамі», Мінпрыроды падрыхтаваны і накіраваны на ўзгадненне праект Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб абыходжанні з адходамі». Прадугледжваецца карэкціроўка шэрагу іншых нарматыўных прававых актаў, што дазволіць больш дакладна кіраваць працэсам абыходжання з медыцынскімі адходамі без шкоды для чалавека і наваколля.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## АЗЕЛЯНІЦЬ ГАРАДЫ І АДНАВІЦЬ ЗЕМЛІ

***— Ад жыхароў краіны паступае шмат нараканняў на работнікаў сістэмы азелянення: няправільна абрэзалі дрэва, ссеклі здаровае, паменшылася колькасць хмызнякоў і інш. Як Мінпрыроды і яго падраздзяленні сочаць за сітуацыяй у гэтай сферы?***

— Толькі за першы квартал 2018 года тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды выявілі больш за 40 фактаў незаконнага выдалення, пашкоджання аб'ектаў раслліннага свету ў населеных пунктах, вінаватыя асобы прыцягнуты да адказнасці. Часта выяўляць такія парушэнні дапамагаюць неабыякавыя грамадзяне.

Парадак выдалення аб'ектаў расліннага свету дэтальна рэгламентаваны заканадаўствам — у якіх выпадках дазваляецца іх выдаляць, на падставе якіх дакументаў і як гэтыя дакументы афармляць. У адносінах да абрэзкі дрэў, хмызнякоў правілы вызначае Мінжылкамгас. І, зразумела, вельмі важную ролю іграе падбор кадраў у сферы азелянення — гэта павінны быць сапраўды прафесіяналы сваёй справы, тады і парушэнняў будзе менш.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу з удзелам Мінпрыроды і іншых зацікаўленых цяпер праводзяць работу па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон «Аб раслінным свеце», якія ў тым ліку будуць накіраваны на ўдасканаленне парадку выдалення аб'ектаў расліннага свету, ажыццяўлення кампенсацыйных мерапрыемстваў. Адна з задач — узмацніць адказнасць заказчыкаў будаўніцтва за выкананне кампенсацыйных пасадак у тых выпадках, калі падрыхтоўчыя работы з выдаленнем выкананы, але з нейкіх прычын будаўніцтва, а разам з ім і правядзенне кампенсацыйных пасадак, зацягваецца ці зусім не завяршаецца.

***— Паводле разлікаў ААН, у наступныя 15 гадоў насельніцтва гарадоў у свеце значна вырасце, што ўзмоцніць іх і цяпер складанае экалагічнае становішча. Як рэалізацыя праектаў «Зялёныя гарады» і «Сімбія Сіці» дапамагае вырашыць існуючыя праблемы?***

— Міністэрства падтрымлівае праекты, якія спрыяюць камфорту і чысціні гарадскога асяроддзя. Для Беларусі гэта вельмі актуальна, бо ў нас узровень урбанізацыі складае 78 %, у той час як агульнасусветны — 55 %.

Такія праекты развіваюцца там, дзе жывуць неабыякавыя людзі і кіраўнікі мясцовай улады займаюць актыўную грамадзянскую пазіцыю. Напрыклад, адзін з самых буйных праектаў у краіне па развіцці «зялёнай» эканомікі — «Сімбія Сіці» ў Брэсце. Удзел у праекце прадугледжвае рэканструкцыю ачышчальных збудаванняў і вадацёкаў — гэтага горад чакаў некалькі гадоў. Частка элементаў праекта будзе ажыццёўлена ў 2019 годзе, калі Брэст адзначыць сваё 1000-годдзе.

Таксама ў рамках «Сімбія Сіці» спецыялісты Мінпрыроды стараюцца зялёную карту Брэста, на якой пазначаюць праблемныя пункты горада. Калі зусім проста тлумачыць, то сутнасць гэтай часткі праекта ў тым, каб не перасякаліся вялікія патокі людзей падчас выкідаў шкодных рэчываў у прамысловых зонах.

Мы зацікаўлены ў рэалізацыі такіх праектаў, але трэба разумець, што, напрыклад, вельмі цікавы досвед Швецыі немагчыма цалкам скапіраваць у Беларусі. Гэта і не трэба. Стасункі з замежнымі спецыялістамі павінны даць штуршок, каб мы стварылі свае тэхналогіі, адаптаваныя пад нашы ўмовы. Усё гэта патрабуе грошай, і я лічу, што мы недастаткова прыцягваем сродкі інавацыйных, інвестыцыйных фондаў. Таксама трэба рацыянальна і з улікам нашых першачарговых патрэб выкарыстоўваць міжнародную фінансавую дапамогу.

Думаю, трэба смялей удзельнічаць у пілотных праектах. Безумоўна, неабходна вучыцца ў замежнікаў, але і свой досвед варта актыўна прапагандаваць сярод калег. Калі да нас прыязджаюць замежныя дэлегацыі, то па выніках візітаў кажуць, што ў нас таксама ўжо ёсць чаму вучыцца.

***— У сельскай мясцовасці адна са значных экалагічных праблем — забруджванне глеб і водаў сцёкамі жывёлагадоўчых комплексаў. Як яна вырашаецца?***

— Жывёлагадоўля — традыцыйна адна з найважнейшых галін сельскагаспадарчай вытворчасці Беларусі, і яе інтэнсіфікацыя для эканомікі краіны — жыццёвая неабходнасць. Таму і ўвага да яе з пазіцый аховы прыроды павінна быць пільнай.

Для вырашэння праблемы забруджвання наваколля ў зоне ўздзеяння жывёлагадоўчых комплексаў варта ўстанавіць пэўныя экалагічныя абмежаванні пры вядзенні жывёлагадоўлі, праводзіць даследаванні адносна мэтазгоднай колькасці жывёлы на адзінку сельскагаспадарчай плошчы, а таксама сачыць за выкананнем экалагічных патрабаванняў да тэхналогій.

Неабходны індывідуальны падыход і да выкарыстання розных відаў арганічных адходаў, транспарціроўкі і ўнясення гною ў глебу. З мэтай зніжэння ўздзеяння аб'ектаў жывёлагадоўлі на навакольнае асяроддзе сёння сельскагаспадарчыя прадпрыемствы прымяняюць тэхналогіі падрыхтоўкі гною да выкарыстання ў якасці арганічнага ўгнаення, раздзяляюць яго на фракцыі кампастуюць, праводзяць анаэробную апрацоўку.

Нягледзячы на тое, што ўкараненне біягазавых комплексаў па перапрацоўцы гною і атрыманні гаручага газу патрабуе значных інвестыцый, гэтыя мерапрыемствы дазволяць эфектыўна перапрацоўваць адходы на жывёлагадоўчых фермах, знізіць экалагічную нагрузку на наваколле, скараціць закупку прыроднага газу, атрымліваць якасныя сельскагаспадарчыя ўгнаенні. Цяпер на базе сельгаспрадпрыемстваў краіны эксплуатуюцца 9 такіх комплексаў.

Але забруджванне — не адзіная праблема, ад якой пакутуюць беларускія землі і глебы. Гэта таксама і дэградацыя ў розных яе формах (водная і ветравая эрозія, мінералізацыя асушаных тарфянікаў, парушэнне зямель пры распрацоўцы радовішчаў карысных выкапняў, правядзенне будаўнічых работ і г. д.). На вырашэнне гэтых пытанняў скіраваны Нацыянальны план дзеянняў па прадухіленні дэградацыі зямель (уключаючы глебы) на 2016—2020 гады, каардынатарам якога выступае Мінпрыроды.

Сярод задач, пастаўленых на 2018 год, — рэкультывацыя 114 унутрыгаспадарчых кар'ераў; унясенне арганічных угнаенняў агульным аб'ёмам больш за 50 млн т для падтрымання ўрадлівасці глеб сельскагаспадарчых зямель; рэканструкцыя і аднаўленне ўчасткаў меліярацыйных сістэм на плошчы звыш 34 тыс. га; пераклад участкаў зямель, схільных да дэградацыі, у катэгорыю зямель ляснога фонду з ажыццяўленнем лесаразвядзення; экалагічная рэабілітацыя ўчасткаў выпрацаваных плошчаў тарфяных радовішчаў, парушаных балот; працяг работы па ўкараненні тэхналогій мінімальнай апрацоўкі глебы, тэхналогій дакладнага земляробства і іншыя мерапрыемствы.

## У КАНТАКЦЕ З ГРАМАДСКАСЦЮ

***— Ужо шмат гадоў Мінпрыроды працуе ў галіне экалагічнай адукацыі. Ці змяняюцца адносіны ў грамадстве да пытанняў аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў?***

— У нас назапашаны немалы вопыт у сферы экаадукацыі, пачынаючы з дзіцячага ўзросту. Выхоўваць адказныя адносіны падрастаючага пакалення да прыроды, фарміраваць у яго экалагічна дружалюбныя паводзіны дапамагаюць створаныя ў краіне «Зялёныя школы».

Мы максімальна выкарыстоўваем пляцоўку міжнароднага супрацоўніцтва з мэтай прыцягнення ў краіну рэсурсаў, накіраваных на забеспячэнне ўстойлівага развіцця, укараненне прынцыпаў «зялёнай» эканомікі, экалагічнай асветы.

Сёння відавочныя станоўчыя змены: у грамадстве адносіны да экалогіі становяцца больш свядомымі, людзі разумеюць важнасць рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў. Прыемна, што насельніцтва актыўна ўдзельнічае ў навядзенні парадку на зямлі, адгукаецца на акцыі «Уладкуем малую радзіму», «Моладзь за чысціню гарадоў і сёлаў», «Зробім!», «Тыдзень лесу», «Дзень без аўтамабіля» і інш.

Ва ўсіх рэгіёнах краіны дзейнічаюць грамадскія экалагі, а пры Мінпрыроды з 2001 года працуе грамадскі каардынацыйны савет, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі больш чым 23 грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў. Яго работа забяспечвае ўзаемадзеянне структурных падраздзяленняў Мінпрыроды з экаграмадскасцю, а таксама дазваляе выпрацаваць узгодненыя рашэнні па пытаннях прыродакарыстання, экалагічнай адукацыі, выхавання і асветы.

***— Андрэй Паўлавіч, вашы пажаданні беларускім грамадзянам да Сусветнага дня навакольнага асяроддзя.***

— Усіх людзей хачу заклікаць удумацца ў гэтыя словы — навакольнае асяроддзе. Гэта ж не толькі прырода, але і дом, вуліца, суседзі. Няхай кожны з нас прыкладзе хоць бы невялікае намаганне для таго, каб навакolle было прыгожым і камфортным. Давайце ўсе разам клапаціцца пра наш агульны здабытак — беларускую прыроду. А калегам хачу падзякаваць за працу і пажадаць яшчэ шмат чаго зрабіць на карысць нашай зямлі і людзей.

**Вераніка КОЛАСАВА,**
**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

# Інвазіўная напасць

## Чым небяспечныя іншаземныя расліны і жывёлы для Беларусі

**Ракі з Амерыкі ці медузы з Кітая — штогод у Беларусь «пранікае» ўсё больш экзатычных і нетыповых для нашай мясцовасці жывёл і раслін. Такое нашэсце «чужынцаў» нясе за сабой шмат праблем. І не толькі экалагічных, але і эканамічных. Адкуль да нас трапляюць новыя віды, якую шкоду яны наносяць і як з імі змагаюцца — расказаў загадчык лабараторыі гідрабіялогіі НПЦ па біярэсурсах НАН Беларусі, кіраўнік міжведамаснага цэнтра па інвазіўных відах Віталь СЯМЕНЧАНКА.**



Па словах спецыяліста, у кожнага з чужародных відаў свой шлях міграцыі, але асноўных усё ж тры. Па-першае, Беларусь — транзітная краіна, што ў разы павялічвае шанцы займець нечаканага госця на сваёй тэрыторыі. Пры тым завезці «чужынца» могуць і не наўмысна, а, напрыклад, з глебай іншай расліны. Так адбылося калісьці з журавінамі, калі хацелі пасадзіць адну культуру, а ў прыдачу атрымалі яшчэ дзесяць інвазіўных. Па-другое, шмат новых раслін і жывёл знаходзяць іншыя месцы жыхарства з-за змены клімату. Ужо не сакрэт, што ў нас з'явілася новая аграрэкліматычная зона, якая характарызуецца больш цёплым летнім і зімнім перыядамі. Па-трэцяе, некаторыя іншаземцы трапляюць у дзякую прыроду па віне звычайных людзей, якія любяць вырошчваць незвычайныя расліны альбо гадаваць экзатычных жывёл.

— Трэба сказаць, што ёсць расліны і жывёлы чужародныя, а ёсць інвазіўныя. Пакуль новы від не наносіць ніякай экалагічнай, эканамічнай альбо сацыяльнай шкоды, ён лічацца чужародным. Як толькі што-небудзь з гэтага спіса праяўляецца, яго ўжо адносяць да інвазіўных, — падкрэсліў Віталь Сяменчанка.

Сёння ў многіх краінах Еўропы і рэгіёнах Расіі існуюць так званыя чорныя спісы жывёл і раслін, а два гады таму і ў Беларусі з'явілася свая «Чорная кніга». Па словах спецыяліста, туды ўключана каля 300 відаў раслін, 6 відаў водных беспазваночных, 21 від насякомых, 1 — рэптылій, 9 відаў рыб і 2 — млекакормячых. Самыя вядомыя з іх — баршчэўнік Сасноўскага, сумнік канадскі, амерыканская норка і інш.

— Калі іншаземцы трапляюць на новую тэрыторыю, яны выцясняюць абарыгенныя віды, а некаторыя з іх пераносяць розныя хваробы, — адзначыў Віталь Сяменчанка. — Так, напрыклад, амерыканскі паласаты рак, які пераносіць рачыную чуму, амаль загубіў нашага беларускага рака ў Нёмане. Зараз ён ужо трапіў у Днепра-Бугскі канал, а потым «заваюе» і Прыпяць.

Каб стрымаць нашэсце «чужынцаў», спецыялісты праводзяць шэраг мерапрыемстваў па барацьбе з інвазіўнымі відамі, а вучоныя ўжо распрацавалі праект, які дапаможа спрагназаваць, адкуль і калі новыя віды могуць да нас трапіць.

Дарэчы, эксперт падкрэсліў, што ў Беларусі пакуль не існуе ўліку эканамічнага ўрону, які нясе наша краіна ад інвазіўных відаў. У той момант, як ЗША, напрыклад, штогод страчваюць каля 140 млрд долараў. Аднак вучоныя вырашылі падлічыць страты ад амерыканскага рака ў басейне ракі Нёман пры ўмове, што ён загубіць 5 % нашага рака. І лічба атрымалася немаленькая — 20 тыс. долараў у год. І гэта толькі адзін інвазіўны від.

**Кацярына ЦІТОВА.**

# МІКРАПЛАСТЫК НА ТАЛЕРЦЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Касметыка — не адзіная крыніца мікрапластыку. Ён дзеліцца на два віды: першасны і другасны. З назвы зразумела, што першасны мікрапластык — гэта маленькія часціцы, якія спецыяльна вырабляюць, а потым дадаюць іх у тавар для надання яму пэўных уласцівасцяў. Другасны ж утвараецца ў выніку распаду пластыкавых пакетаў і бутэлек, пры сціранні аўтамабільных шын, адслаенні старой фарбы, мыцці сінтэтычнага адзення і нават з пылу, які збіраецца ўнутры будынка.

## У ЧЫМ ЯГО ШКОДНАСЦЬ?

— Мікрапластык сёння знаходзяць у вадаёмах па ўсім свеце, — расказаў **загадчык навукова-даследчай лабараторыі гідраэкалогіі БДУ Барыс АДАМОВІЧ.** — Але пакуль няма ніводнага даследавання, дзе б навукова абгрунтоўваўся яго ўплыў на здароўе чалавека і навакольнае асяроддзе. Аднак уплыў гэты несумненна існуе.

А **старшы выкладчык кафедры гігіены і медыцынскай экалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Ірына МАШЧАНКА** адзначае, што мікрапластык бяспечны да таго часу, пакуль не аказваецца ў каналізацыі.

— Ён становіцца таксічны, калі вылучае манамеры, а гэта адбываецца пры награванні. Касметыку мы не награваем, таму мікрапластык у гэтым выпадку бяспечны для здароўя. Да таго ж, уся касметычная прадукцыя, прадстаўленая на нашым рынку, праходзіць працэдуру ацэнкі адпаведнасці ў Міністэрстве аховы здароўя, — падкрэсліла спецыяліст. — Аднак не варта забываць, што ўсё, чым мы мыемся, трапляе ў акіян, паколькі ачышчальныя збудаванні не здольныя ўлавіць дробныя часціцы пластыку. У выніку, у нас з'яўляецца небяспека з'есці наш жа скраб. Па некаторых звестках, у сярэднім еўрапеец разам з рыбай і морапрадуктамі з'ядае 11 тысяч мікрагранул у год.






## ЯК ВЫРАШАЕЦЦА ПРАБЛЕМА

Забруджванне вадаёмаў мікрапластыкам сур'ёзна абмяркоўваецца на міжнародным узроўні. Паступова ў Еўропе забараняюць яго выкарыстанне ў касметыцы і абавязваюць вытворцаў сінтэтычнага адзення праводзіць першаснае прамысловае мыццё з выкарыстаннем спецыяльных фільтраў, здольных утрымліваць часцінкі мікрапластыку. У Беларусі нядаўна супрацоўнікі Цэнтра экалагічных рашэнняў з дапамогай валанцёраў правялі першае ў нашай краіне даследаванне, якое дапамагло апісаць сітуацыю з мікрапластыкам у касметыцы і ў беларускіх вадаёмах.

— За месяц мы вывучылі саставы 890 розных касметычных сродкаў. Пры гэтым звярталі ўвагу на прадукцыю розных вытворцаў, пазіцыянавання і кошту. У выніку мікрапластык з складзенага намі спіса быў знойдзены ў 147 сродках. Гэта значыць, каля 16,5 % праверанай касметыкі змяшчае гэтыя штучныя кампаненты, — расказала Марыя Сума.

Эксперт адзначыла, што ў выпадках з мікрапластыкам кошт — не паказчык, мікрачасцінкі знаходзілі як у бюджэтнай, так і ў дарагой касметыцы. «Натуральная» і дзіцячая касметыка таксама не апынуліся ўбаку.

У вадаёмах сітуацыя аказалася не лепшай: у кожнай з 28 даследаваных рэк валанцёры знайшлі мікрапластык.

